ЯК ВАЛЬМЕН АЛАДАЎ УРАТАВАЎ РАЎБІЦКІ КАСЦЁЛ? 9

ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНАЯ ЛІШНЯЯ ВАГА? 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

11 СНЕЖНЯ 2021 г. СУБОТА № 240 (29609)

ЛІЧБА ДНЯ

Больш за 3 млн 896 тысяч

беларусаў атрымала першую дозу вакцыны супраць COVID-19, з іх больш чым 3 млн 110 тысяч прайшло поўны курс вакцынацыі, паведаміла Міністэрства аховы здароўя.

У Брэсцкай вобласці поўны курс вакцынацыі прайшло больш за 398,7 тысячы чалавек, Віцебскай — больш за 327,6 тысячы, Гомельскай — больш за 538,3 тысячы, Гродзенскай — больш за 369,2 тысячы, Магілёўскай — больш за 391 тысячу, Мінскай — больш за 396,1 тысячы і Мінску — больш за 602,9 тысячы чалавек.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы мусім разлічваць толькі на свае сілы»

Прэзідэнт выступіў на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета

Форум у рэжыме відэаканферэнцыі праходзіў у двух фарматах — вузкім і пашыраным складам. Лідары вузкім складам абмеркавалі выкананне сваіх леташніх рашэнняў аб кірунках развіцця інтэграцыі да 2025 года, разгледзелі прымяненне навігацыйных пломбаў у ЕАЭС. У парадку дня работы пашыранага складу савета было каля двух дзясяткаў пытанняў: ад асноўных напрамкаў міжнароднай дзейнасці ЕАЭС на 2022 год да разгляду бюджэту.

Фота БелТА.

Са снежня мінулага года сустрэчы Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ладзяцца ў відэарэжыме. Такім чынам яны прайшлі ўжо шосты раз за два гады. Таму Аляксандр Лукашэнка заявіў: разлічвае, што гэты год будзе апошнім, калі лідары вырашаюць важныя пытанні «па тэлевізары».

«Хопіць нам арыентавацца на заходнія памперсы і чыпсы»

У сваім дакладзе Прэзідэнт Беларусі засяродзіў асаблівую ўвагу калег на лічбавізацыі перавозак, змяненні некаторых палажэнняў Дагавора аб Саюзе, узаемадзеянні з Кітаем для спалучэння ЕАЭС з ініцыятывай «Адзін пояс, адзін шлях», заснаванні высокатэхналагічных праектаў для далейшага захавання дынамікі росту. Але перад тым як перайсці да разгляду гэтых пытанняў парадку дня, Прэзідэнт праінфармаваў калег па тэме, якая зараз ва ўсіх на слыху: праблема бежанцаў на беларускай граніцы.

СТАР. 2

КАРОТКА

- Міністэрства аховы здароўя паведаміла аб паралельным цыркуляванні ў Беларусі каранавіруса і грыпу.

- **Рэспубліканскі прававы турнір «Сіла Закона» стартуе ў Беларусі 13 снежня.**
- Новая кампанія «Вялікага каменя» будзе ствараць трэнажоры для адпрацоўкі мануальных навыкаў у хірургіі.
- **Лыжная траса пачала дзейнічаць у аграгарадку Мір Баранавіцкага раёна.**

Ведай сваё!

НЕ ДРАНІКАМ АДЗІНЫМ

Што чакаць ад гастранамічнага турызму?

Калі раней ежа была толькі адным са складнікаў пэўных турыстычных праграм, то сёння яе навучыліся выкарыстоўваць як матывацыю для падарожжаў. Як заўважыла кансультант аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Кацярына НІКІЦІНА, у эпоху эканомікі ўражанняў кулінарныя традыцыі становяцца запатрабаванымі як элемент пазнання краіны. Сёння падарожнікі гатовы выпраўляцца туды, дзе традыцыі прыгатавання страў перадаюцца праз пакаленні.

КАВЯРНЯ З СЯРЭДНЯВЕЧНЫМ МЕНЮ

Відаць, наспеў час, калі ўжо варта адыходзіць ад іміджу чаркі, шкваркі ды дранікаў. Наша кухня багатая і цікавая — праблема толькі ў тым, што гэты пласт нацыянальнай культуры пакуль застаецца невядомым нават для саміх беларусаў. А значыць, гастранамічныя сакрэты маглі б стаць шыкоўным рэсурсам для развіцця ўнутранага турызму. Тая ж бульба на беларускіх землях пачала ўжывацца толькі з сярэдзіны XVIII стагоддзя. Свае асаблівасці былі ў сялянскай, шляхетнай, мяшчанскай кухнях. Кулінарныя традыцыі фарміраваліся стагоддзямі. Найбольш аўтэнтычныя звесткі аб харчовых звычках беларусаў захоўваюцца ў інвентарах XVI стагоддзя.

СТАР. 7

Новы трэнд

СА СТАЛІЦЫ — У ГЛЫБІНКУ

Маладыя сужэнцы ЛАТКОВІЧЫ пераехалі з Мінску ў Докшыцкі раён на сталае месца жыхарства. Жывуць у вёсачцы Рапяхі, ад якой да райцэнтра пятнаццаць кіламетраў. На сёння ў гэтым населеным пункце некалькі дамоў і ніякага сэрвісу: няма крамы, ФАПа, клуба і ўсяго астатняга. Але былыя мінчане не плануюць з'язджаць, прынамсі, у найбліжэйшыя гады. У іх козы, цяля, куры, вялікі агарод. Збіраюцца набыць карову. Логіку былых мінчан паспрабаваў зразумець карэспандэнт «Звязды».

СТАР. 5

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы

ISSN 1990 — 763X

«Мы мусім разлічваць толькі на свае сілы»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Актуальнасць гэтага пытання на форуме ЕАЭС абгрунтавана тым, што прадстаўнікі заходніх дзяржаў і ЗША звярталіся ў міністэрствы замежных спраў членаў саюза з просьбай падключыцца да ціску на Беларусь.

«Вы павінны разумець, што ***Злучаныя Штаты і калектыўны Захад ад сваёй палітыкі не адыдуць. Ім неабходныя нагоды для ціску на нашу брацкую Расію і на нас у тым ліку.*** Вось чарговую нагоду знайшлі — бежанцы. Ведаеце, што не мы спарадзілі гэтую праблему. І не вы, былыя постсавецкія рэспублікі. Але гэта выкарыстоўваецца як перадумова для ціску, перадусім на Беларусь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што супраць нашай краіны ўжо ўведзены пяты пакет санкцый, рыхтуць яшчэ некалькі для «эканамічнага ўдушэння Беларусі, для змены не толькі ўлады, але і дзяржаўнага ладу». Кіраўнік краіны падзякаваў Расіі і іншым краінам, што аказваюць падтрымку ў супрацьстаянні ціску.

«Яшчэ раз падкрэсліваю: вас будуць душыць, настройваючы супраць Беларусі, каб вы падключыліся да гэтых санкцый супраць нашай краіны. Мая просьба, каб мы, не адцягваючы ўвагу на гэта, былі разам, бо ціск будзе нарастаць. Ціскам на Беларусь і Расію Захад не абмяжуецца», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, відавочна, што рэальная мэта Захаду заключаецца ў метадычным знішчэнні канкурэнтаў. ***«Гэтая сітуацыя наглядна прадэманстравала, што сяброў у нас там няма.*** Таму мы мусім разлічваць толькі на свае сілы. І меў рацыю Нурсултан Абішавіч (Назарбаеў. — **«Зв.»**), які казаў пра самадастатковасць нашага саюза. Мы можам сябе забяспечыць усім неабходным. І другое пытанне, што мне вельмі спадабалася, — імпартазамяшчэнне. ***Хопіць нам арыентавацца на заходнія памперсы і чыпсы. Мы самі можам вырабіць нават гэта»,*** — упэўнены кіраўнік краіны.

Пра эфектыўную абарону эканамічных інтарэсаў

Пераходзячы да пытанняў парадку дня сустрэчы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, нягледзячы на складаную сітуацыю на сусветным рынку, у бягучым годзе амаль усе краіны ЕАЭС маюць двухзначны рост экспарту на знешнія рынкі. І гэта добры сігнал.

«У планавым парадку ідзе рэалізацыя стратэгічных напрамкаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года. Нягледзячы на некаторыя цяжкасці, працягваецца паступальная работа па фарміраванні агульных рынкаў саюза. Разам з тым захоўваецца шэраг пытанняў прынцыповага характару й частцы стварэння агульных рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў. Думаю, мы ў найбліжэйшыя часы зможам вочна абмеркаваць і гэтыя пытанні», — дадаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што трэба будзе падпісаць Пагадненне аб прымяненні ў ЕАЭС навігацыйных пломбаў для адсочвання перавозак, якія з'яўляюцца адным з асноўных элементаў адзінай сістэмы мытнага транзіту саюза.

«Лічбавізацыя перавозак сёння поўнасцю адпавядае духу часу. Прымяненне навігацыйных пломбаў дасць магчымасць павысіць узровень даверу ў гандлі паміж нашымі краінамі, аптымізаваць кантрольныя мерапрыемствы на ўнутраных межах, павялічыць транзітную прывабнасць ЕАЭС», — акцэнтуе ўвагу Аляксандр Лукашэнка.

На пасяджэнні будзе падпісаны другі Вялікі Пратакол аб унясенні змяненняў у Дагавор аб Саюзе па шырокім коле пытанняў: прымяненне антыдэмпінгавых мер у адносінах да трэціх краін, канкурэнцыя і дзяржаўнае цэнавае рэгуляванне, спагнанне ўскосных падаткаў і механізм кантролю за іх выплатай, тэхнічнае рэгуляванне і шматлікае іншае.

Кіраўнік краіны прапанаваў засяродзіцца на некалькіх ключавых пытаннях на міжнародным трэку ў адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі міжнароднай дзейнасці саюза на 2022 год. «Наша сумесная работа на знешнім контуры і дзейнасць Камісіі павінны быць арыентаваны перш за ўсё на вырашэнне практычных задач развіцця экспарту тавараў і паслуг. І Кітай тут займае асабліва месца. Лічу неабходным акцэнтаваць увагу на ўзаемадзеянні з гэтай краінай у рамках спалучэння планаў развіцця ЕАЭС, ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях» і Пагаднення аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве 2018 года», — адзначае Прэзідэнт.

Ён настойвае на працягу дыялогу з Егіптам і Іранам для завяршэння перагавораў па пагадненнях аб свабодным гандлі, а таксама актывізацыі яго з Ізраілем. Чакае беларускі бок хуткага прыняцця рашэння па мэтазгоднасці пачатку перагавораў з Інданезіяй і Манголіяй аб зоне свабоднага гандлю.

«Акрамя таго, неад'емным элементам міжнароднай дзейнасці як у 2022 годзе, так і ў доўгатэрміновай перспектыве павінна стаць эфектыўная абарона эканамічных інтарэсаў нашага саюза», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Узняў ён яшчэ адно важнае пытанне. Бягучая ўдалая кан'юнктура ў знешнім гандлі, на яго думку, мае цыклічны характар. Каб захаваць станоўчую дынаміку эканамічнага росту, у 2022 годзе трэба сфакусіравацца на рэалізацыі некаторых мерапрыемстваў.

«Перш за ўсё трэба актывізаваць прамысловую кааперацыю па сумеснай вытворчасці новай, запатрабаванай на сусветным рынку прадукцыі, — дадае Прэзідэнт. — Важным практычным крокам у гэтым напрамку будзе ўзгодненне пераліку сумесных маштабных высокатэхналагічных праектаў, а таксама вызначэнне ўмоў іх фінансавання і рэалізацыі. Над такімі праектамі мы з Расійскай Федэрацыяй працуем».

Для вырашэння гэтай задачы ў найбліжэйшыя гады неабходна асабліваю ўвагу ўдзяліць укараненню інавацыйных тэхналогій, каб не страціць знешнія рынкі, акцэнтуе кіраўнік краіны. Ён заўважае, што акумуляванне сумесных намаганняў і навуковага патэнцыялу краін дасць магчымасць зрабіць гэта з максімальнай аддачай.

«Яшчэ адным неабходным элементам для гарманічнага развіцця прамысловасці і паспяховай кааперацыі ў гэтай сферы з'яўляецца збліжэнне інструментаў і ўмоў дзяржпадтрымкі прамысловасці ў нашых краінах. Заклікаю адказна падысці да гэтай тэмы», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што ў рамках фарміравання агульнага рынку дзяржаўных закупак у наступным годзе неабходна забяспечыць узаемнае прызнанне электроннага лічбавага подпісу і вызначыць на ўзроўні саюза комплекс мер па далейшай лічбавізацыі дзяржаўных закупак у нашых краінах.

«Для гэтых мэт мы таксама павінны вырашыць ужо не новае пытанне — узаемнае прызнанне гарантый, якія выдаюцца банкамі нашых краін», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што трэба вывучыць мэтазгоднасць карэкціроўкі палажэнняў стратэгіі з улікам прынятай заявы аб кліматычным парадку дня і мэт па руху да нізкавугляроднай эканомікі.

У заканчэнні выступлення Прэзідэнт падзякаваў свайму казахстанскаму калегу Касыму-Жамарту Такаеву за завяршэнне плённага старшынства ў органах саюза і пажадаў поспехаў Кыргызстану, які прымае гэтую эстафету ў наступным годзе.

Як праходзілі перагаворы кіраўнікоў краін ЕАЭС у закрытым фармаце вузкім складам, расказаў журналістам **віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА.** Ключавым пытаннем было абмеркаванне рэалізацыі «Стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года». Дакумент прыняты год таму ў перыяд старшынства беларускага боку.

«Кіраўнікі краін у сваіх выступленнях падтрымалі пагадненне ад прасочваемасці пломбаў. Яно доўга рыхтавалася, але дазволіць нам паскорыць транзітныя пастаўкі на прасторы ЕАЭС, па-за межамі. Мы паставім бар'ер многім шэрым схемам, што былі. Я думаю, празрыстасць рэалізацыі і аб'ёмы гандлю павялічацца», — сказаў намеснік прэм'ер-міністра.

Будзе створана адмысловая рабочая група, што зойме цца распрацоўкай адзінага мер аховы інфармацыі, змешчанай у навігацыйнай пломбе.

Таксама ўсе краіны прынялі рашэнне аб забароне вывазу лесу-кругляка з Расіі за межы ЕАЭС. «Лес будзе пастаўляцца для ўнутраных патрэб у краіны-члены ЕАЭС толькі ў тых аб'ёмах, якія неабходныя для спажывання суб'ектаў гаспадарання. То-бок знешні контур закрываецца», — расказаў Ігар Петрышэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

У тэму

Касым-Жамарт ТАКАЕЎ, прэзідэнт Казахстана: «Аб'ёмы ўзаемнага гандлю за дзевяць месяцаў бягучага года выраслі на 32,5 працэнта і дасягнулі 52 мільярдаў долараў. Гэта больш за паказчык даковіднага перыяду на 16,5 працэнта. Вырас аб'ём экспарту паміж краінамі саюза. Напрыклад, рост аб'ёмаў экспарту Казахстана склаў 39 працэнтаў. У супастаўных лічбах вырас таксама экспарт і іншых краін — удзельніц саюза. Гэта сведчыць пра дынамічнае развіццё гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, паляпшэнне яго структуры і рост канкурэнтаздольнасці адпаведных галін».

Нікол ПАШЫНЯН, прэм'ер-міністр Арменіі: «Яшчэ адным ключавым складнікам эфектыўнага развіцця аб'яднання, выдзеленым у стратэгіі, з'яўляецца пашырэнне гарызонтаў міжнароднага супрацоўніцтва і стварэнне шырокай сеткі гандлёва-эканамічных сувязяў. У гэтым кантэксце лічу важным яшчэ раз звярнуць увагу на зацікаўленасць у хутчэйшым заключэнні поўнафарматнага пагаднення аб свабодным гандлі паміж Іранам і ЕАЭС. Вопыт функцыянавання часовага пагаднення з Тэгеранам наглядна паказаў наяўнасць патэнцыялу і перспектывы далейшага паглыблення супрацоўніцтва».

Садыр ЖАПАРАЎ, прэзідэнт Кыргызстана: «Бягучы крызіс і яго згубны ўплыў на эканоміку ўсяго саюза, уключаючы павышэнне ўзроўню беднасці, скарачэнне працоўных месцаў і нарастанне разрыву ў развіцці, безумоўна, патрабуе ўвагі да пытання ўстойлівага развіцця эканомікі нашага інтэграцыйнага аб'яднання. У гэтых мэтах нам неабходна сумеснымі намаганнямі ўкараняць дзейсныя механізмы падтрымкі рэалізацыі кааперацыйных праектаў, стварацьлагістычную інфраструктуру і гандлёва праводзячыя сістэмы, што акажуць станоўчы ўплыў на павелічэнне аб'ёмаў экспарту тавараў і развіццё нашых эканомік у цэлым».

Уладзімір ПУЦІН, прэзідэнт Расіі: «Барацьба з каранавіруснай інфекцыяй стымулюе нашы краіны да больш цеснага партнёрства ў фармацэўтычнай індустрыі і ў цэлым у галіне медыцыны. Я памятаю, як прэм'ер-міністр Арменіі быў ініцыятарам як бы разгортвання нашай сумеснай работы па гэтым напрамку і нават прапаноўваў цэлую праграму ў сувязі з гэтым. Вось, уласна кажучы, мы зараз яе і ажыццяўляем. У адпаведнасці з даручэннямі, якія мы далі ў рамках нашага пасяджэння ў снежні мінулага года, у большасці дзяржаў ЕАЭС паспяхова наладжаны выпуск расійскіх вакцын».

Парламенцкі дзённік

Уніфікацыя заканадаўства і форум рэгіёнаў

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з намеснікам старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Канстанцінам КАСАЧОВЫМ.

Наталля Качанава падзякавала за падтрымку, якую аказвае Расійская Федэрацыя нашай краіне:

— Мы не проста надзейныя партнёры, але добрыя сябры, якія заўсёды падстаўляць плячо і будуць ісці разам.

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што ў рэалізацыі 28 саюзных праграм, падпісаных кіраўнікамі Беларусі і Расіі на Вышэйшым дзяржаўным савеце Саюзнай дзяржавы, парламентарыяў чакае вялікая праца, у тым ліку па ўніфікацыі заканадаўства.

Акрамя таго, нагадала Наталля Качанава, ужо распачалася падрыхтоўка да чарговага IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, правядзенне якога запланавана сёлета ў чэрвені.

— Прапановы, якія паступілі ад Савета Федэрацыі, мы разгледзелі і згодны з прапанаванай тэматыкай і датай правядзення. Упэўнена, што разам мы зможам вырашыць задачы, што стаяць перад нашымі народамі, — падкрэсліла яна.

Са свайго боку віцэ-спікер Савета Федэрацыі падзякаваў Наталлі Качанавай за магчымасць сустрэцца і перадаў шчырае прывітанне ад старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціны Мацвіенкі. Паводле слоў госця, спікер верхняй палаты расійскага парламента высока цэніць прафесійныя і асабістыя адносіны, якія склаліся паміж палатамі.

— Кажучы пра сітуацыю на Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, у нас не было ні ценю сумневу, што мы павінны ў яе ўключыцца самым актыўным чынам, — падкрэсліў Канстанцін Касачоў.

Вольга АНУФРЫЕВА.

На слыху

Дзеля памяці і справядлівасці

Праект Закона «Аб генацыдзе беларускага народа» апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь

Упершыню на заканадаўчым узроўні дадзена справядлівая ацэнка злодзействам фашыстаў і іх памагатых на беларускай зямлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ў пасляваенны перыяд. Дакументам таксама прадугледжана ўвекавечванне ахвяр генацыду беларускага народа. Акрамя таго, публічнае адмаўленне генацыду панясе за сабой крымінальную адказнасць — у найбліжэйшы час у Крымінальным кодэксе з'явіцца новы артыкул.

У прыватнасці, адмаўленне генацыду беларускага народа ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або ў пасляваенны перыяд падчас публічнага выступлення або ў друкаваным варыянце, у тым ліку ў СМІ і ў інтэрнэце, будзе прадугледжваць арышт або абмежаванне волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленне волі на той жа тэрмін. Публічнае адмаўленне генацыду, здзейсненае паўторна або з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

«Закон прыняты з мэтай захавання памяці аб мільёнах савецкіх грамадзян, якія сталі ахвярамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд, накіраваны на заканадаўчае забеспячэнне абароны фундаментальных каштоўнасцяў беларускага народа, устанаўлення дзейсных бар'ераў на шляху спроб фальсіфікацыі падзей і вынікаў Другой сусветнай вайны, дачы справядлівай ацэнкі злачынствам нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых, нацыяналістычных фарміраванняў у гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд», — адзначаецца ў дакументе.

Як заўважыла **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ірына ДАЎГАЛА,** улічваючы грамадскую значнасць, рэзананс дадзенай тэмы, закон атрымае падтрымку не толькі ў дэпутацкага корпуса, але і ў беларускага народа. «Над расследаваннем злачынства супраць чалавецтва, беларускага народа сёння працуюць практычна ўсе рэгіянальныя, раённыя, гарадскія, абласныя камісіі пад кіраўніцтвам Генеральнай пракуратуры, — паведаміла дэпутат. — Галоўныя задачы, якія перад імі ставяцца, — устанавіць усе населеныя пункты, якія былі спалены гітлераўцамі і іх памагатымі, месцы пахавання загінулых людзей, менавіта мірнага насельніцтва, якое знішчалі падчас вайны. Мяркуецца ўстанавіць імёны ўсіх катаў, дзе б яны сёння ні жылі (пры ўмове, што яны яшчэ жывыя). Калі даведваешся, якую мэту ставілі перад сабой фашысцкія акупанты, становіцца проста балюча, бо генеральным планам прадугледжвалася пакідаць усю захопленую тэрыторыю мёртвай. Самы вялікі жах быў яшчэ і ў тым, што людзей дзялілі па нацыянальнай прыкмеце, хоць яшчэ і ў дакументах даваеннага перыяду гаварылася аб тым, што ўсе людзі роўныя. З улікам цяперашняй грамадска-палітычнай сітуацыі, тых выклікаў, як знешніх, так і ўнутраных, для нашай краіны гэты закон больш чым неабходны».

Вераніка КАНЮТА.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Аляксандры Аляксандраўне Саніковіч, саветніку-кансультанту ўпраўлення па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

На парадку дня

Устойлівасць да выклікаў

Прэм'ер-міністр расказаў парламентарыям аб стане эканомікі

Учора падчас сустрэчы з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў і членамі Савета Рэспублікі ў Авальнай зале па абмеркаванні пакета бюджэтных законапраектаў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка паведаміў пра надзённыя праблемы ў фінансава-эканамічнай сферы і іх вырашэнне.

Фота БелТА.

«У бягучым перыядзе эканоміка функцыянуе ў няпростых умовах нарастаючага знешняга санкцыйнага ціску і абмежаванняў, звязаных з пандэміяй COVID-19. Гэтыя фактары аказваюць значны ўплыў на стан дзелавой і інвестыцыйнай актыўнасці. У такіх умовах наша эканоміка ў цэлым дэманструе ўстойлівасць да эканамічных выклікаў і пагроз, якія ўзнікаюць пастаянна. Пры гэтым урадам выконваецца асноўная мэтавая задача на бягучы год — павышэнне ўзроўню дабрабыту насельніцтва на аснове збалансаванага эканамічнага росту», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, стабільна і ў цэлым эфектыўна функцыянуюць бізнес і дзяржаўныя ўстановы. «Выконваюцца ўсе сацыяльныя абавязацельствы і гарантыі дзяржавы. Захоўваецца колькасць занятых у эканоміцы, узровень беспрацоўя ў прагнозным калідоры. Рэальныя наяўныя даходы насельніцтва павялічыліся на 2,6 працэнта, а рэальная зарплата — на 4,8 працэнта. Пры гэтым у рэальным сектары эканомікі зарплата расце выключна за кошт росту прадукцыйнасці працы, — адзначыў прэм'ер. — Урадам вытрымліваюцца, як і вызначана праграмай дзейнасці ўрада і пяцігадовай праграмай развіцця краіны, суадносіны зарплаты бюджэтнікаў і сярэдняй па краіне на ўзроўні, не ніжэйшым за 80 працэнтаў (маем 80,1 працэнта). Зарплата ўрачоў і настаўнікаў ужо складае 156,2 працэнта і 81,1 працэнта да сярэдняга ўзроўню па краіне адпаведна».

Раман Галоўчанка падкрэсліў, што ў цэлым эканоміка збалансавана, забяспечваецца яе якасны рост.

«За 10 месяцаў бягучага года тэмп росту ВУП склаў 102,4 працэнта. Прагноз на год — 101,8 працэнта. Гэта значыць, ідзём з перавыкананнем. Пры гэтым важна, што рост забяспечаны пераважна за кошт экспарту», — сказаў Раман Галоўчанка.

Ён дадаў, што ўстойліва спрацавалі ўсе галіны эканомікі. «Выключэнне склалі ў выніку вядомых абставін толькі сельская гаспадарка і будаўніцтва. Асабліва хачу адзначыць, што палепшыліся фінансавыя вынікі работы арганізацый. Колькасць страт арганізацый знізілася на 7,8 працэнта, а сума чыстай страты скарацілася ў 5 разоў», — канстатаваў ён.

«Мы разлічыліся па знешніх даўгах у бягучым годзе практычна на $2 млрд. І да канца года на гэтыя мэты накіруем яшчэ $280 млн, — сказаў Раман Галоўчанка. — Такім чынам, выплаты па знешнім доўгу будуць забяспечаны ў бягучым годзе ў поўным аб'ёме».

Пры гэтым узровень міжнародных рэзервовых актываў з пачатку года вырас на $1,1 млрд. «На 1 снежня бягучага года нашы золатавалютныя рэзервы склалі $8,5 млрд», — адзначыў прэм'ер.

Асобна Раман Галоўчанка спыніўся на мерах, якія прымаюцца супраць уведзеных Захадам санкцый. «Страты на заходнім напрамку ад санкцый мы ацанілі, кампенсуем іх за кошт нарошчвання прысутнасці на рынках Расіі, краін Азіі і Афрыкі. Стратэгічнымі партнёрамі застаюцца для нас Расія і Кітай. Прырост экспарту на гэтых рынках плануем у межах сярэдніх значэнняў (каля 6 працэнтаў). Актыўна будзем працаваць па пашырэнні геаграфіі паставак», — сказаў ён.

Беларусь з 1 студзеня ў адказ на санкцыі ўводзіць харчовае эмбарга на шэраг тавараў з дзяржаў, якія ажыццяўляюць недружалюбныя дзеянні да нашай краіны. «Мы не раз папярэджвалі аб тым, што дзеянні ў адносінах да нашай краіны не застануцца беспакаранымі. Але, вядома ж, прымаючы гэтае рашэнне, падлічваліся рызыкі. Зразумела, што ні адно контрсанкцыйнае дзеянне не з'яўляецца абсалютна лёгкім. Тым не менш мы прааналізавалі вопыт нашых расійскіх партнёраў, якія пайшлі на такі крок у 2014 годзе, улічылі тыя асаблівыя моманты, што не былі ўлічаны ў той час», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, пры фарміраванні таварных груп, якія падпадаюць пад эмбарга, у першую чаргу выходзілі з тых пазіцый, што могуць закрыць айчынныя вытворцы. «Пад эмбарга не трапілі рыба і рыбная прадукцыя, паколькі ў адрозненне ад Расіі мы не маем доступу да мора. Туды не трапілі такія значныя пазіцыі, як прадукты дзіцячага харчавання, прадукты спецыяльнага харчавання для людзей з пэўнымі захворваннямі. Па ўсіх астатніх пазіцыях, акрамя пэўных відаў агародніны і фруктаў, рынак могуць закрыць нашы вытворцы», — адзначыў прэм'ер-міністр.

«Што датычыцца агародніны і фруктаў, ёсць пазіцыі, якія ў Беларусі расці не могуць апрыёры. Напрыклад, мандарыны, хурма. Тым не менш тут няма ніякай праблемы: ужо цяпер тыя ж мандарыны пастаўляюцца з некалькіх краін — не толькі Італіі, Іспаніі, якія трапілі пад эмбарга, але і Марока, ПАР, Бразіліі, Турцыі. Каб не дапусціць дэфіцыту на рынку гэтых пазіцый, МАРГ даручана правесці жорсткую работу з імпарцёрамі для таго, каб яны хутка пераарыентаваліся на замяшчэнне таварамі з іншых краін. Напрыклад, да нас даўно звярталіся партнёры па ЕАЭС і СНД, якія зацікаўлены ў нарошчванні паставак плодаагароднінай прадукцыі, сухафруктаў, арэхаў», — звярнуў увагу Раман Галоўчанка

«Рашэнне для нас нетрадыцыйнае, таму могуць узнікаць нейкія складанасці. Але я ўпэўнены, што гэта рашэнне правільнае, абсалютна аб'ектыўнае. Магчымыя вузкія моманты мы абавязкова адрэагуем у працэсе імплементацыі новых норм. Думаю, насельніцтву няма аб чым хвалявацца», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

***

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА па выніках сустрэчы парламентарыяў з прэм'ер-міністрам і членамі ўрада адзначыў: «Год чакаецца няпросты. Мы будзем працаваць ва ўмовах жорсткай знешнепалітычнай абстаноўкі, санкцый, ковідных абмежаванняў. Безумоўна, тут на першае месца выходзіць комплексная, сістэмная і зладжаная работа органаў дзяржаўнага кіравання па вырашэнні тых задач, якія мы сёння вызначаем. Але я хацеў бы сказаць, што тут вельмі вялікая ступень адказнасці ў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка, дадаўшы, што галоўная з задач — якаснае заканадаўчае забеспячэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. «Нам яшчэ трэба ўважліва папрацаваць над шэрагам законаў, якія трэба прыняць у гэтым годзе і, вядома, на наступны год, — адзначыў спікер. — Паколькі драйверам росту ў 2022 годзе будзе экспарт, дэпутатам трэба ўдзяліць вельмі сур'ёзную ўвагу такому пытанню». Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў: парламентарыям варта больш сур'ёзную ўвагу ўдзяліць рабоце ў выбарчых акругах: «Значыць, будзем гаварыць у літаральным сэнсе гэтага слова, хварэць душой за развіццё сваіх рэгіёнаў, дапамагаць мясцовым органам улады ў вырашэнні праблем, якія існуюць на месцах».

Паводле БелТА.

У тэму

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 482 «Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2022 год», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Згодна з дакументам, грашова-крэдытная палітыка ў 2022 годзе будзе нацэлена на падтрыманне інфляцыі на ўзроўні 6 працэнтаў.

Прадоўжыцца кантроль за ростам грашовага прапанавання. Сярэдняя шырокая грашовая маса павялічыцца на 7—13 працэнтаў у гадавым выражэнні, рублёвая грашовая база — на 8—13 працэнтаў.

Нацыянальнаму банку прадпісана фарміраваць умовы для крэдытавання на ўзроўні, які дае магчымасць падтрымаць эканамічную актыўнасць і не дапусціць нарастання сістэмных рызык. Пры гэтым прадугледжваецца, што патрабаванні банкаў да эканомікі вырастуць у 2022 годзе на 7—11 працэнтаў.

Курсавая палітыка, як і раней, будзе праводзіцца ў рэжыме плавающага курса, які фарміруецца пад дзеяннем попыту і прапанавання на валютным рынку. Дапускаецца правядзенне валютных інтэрвенцый для недапушчэння рэзкіх ваганняў курса беларускага рубля, а таксама папаўнення золатавалютных рэзерваў.

З улікам аб'ёмаў будучых выплат прагназуецца, што золатавалютныя рэзервы на канец 2022 года складуць не менш за $7 млрд.

Кантэкст

ЛІТВА ЗАГАВАРЫЛА ПРА БАНКРУЦТВА

Дзяржаўная кампанія Lietuvos gelezinkeliai («Чыгунка Літвы») можа сутыкнуцца з рызыкай банкруцтва ў выпадку судовых іскаў з боку беларускай кампаніі «Беларуськалій» за спыненне транзіту калійных угнаенняў праз Літву. Аб гэтым заявіў кіраўнік прадпрыемства Мантас Бартушка, паведаміла ТАСС са спасылкай на агенцтва BNS.

Па яго словах, Lietuvos gelezinkeliai не плануе і не будзе спыняць транзіт беларускіх калійных угнаенняў, паколькі гэта пагражае ёй банкруцтвам. Аднак прынята ўладамі Літвы закона аб забароне на транзіт «Беларуськалія» магло б стварыць прававую падставу і абараніла б прадпрыемства. «Калі гэта не будзе зроблена і Lietuvos gelezinkeliai скасуе дагавор раней за тэрмін, іншы бок можа запатрабаваць кампенсацыі страчаных даходаў. Калі суд задаволіць хаця б частку такога іску, Lietuvos gelezinkeliai пагражае банкруцтва», — заўважыў ён.

Мантас Бартушка мяркуе, што нават у тым выпадку, калі дзяржавай будзе прынятае рашэнне аб спыненні транзіту «Беларуськалія», цалкам верагодна, што беларускі бок усё роўна звернецца ў міжнародны арбітраж. «У любым выпадку мы апынемся ў міжнародным арбітражы, таму для нас вельмі важна, каб было прынята цвёрдае ў прававых адносінах рашэнне», — адзначыў ён. Мантас Бартушка таксама заявіў, што санкцыі ЗША ў дачыненні да «Беларуськалія» не з'яўляюцца законнай падставай для спынення аперацый літоўскімі чыгункамі.

Сітуацыю пракаментаваў і міністр транспарту і камунікацый Літвы Марус Скуадзіс. Паводле яго слоў, прымаць «безразважныя і імпульсіўныя» рашэнні ў гэтым пытанні недапушчальна. «Я маю на ўвазе магчымыя судовыя працэсы, іх маштаб, і таму мы не можам дазволіць сабе прымаць хуткія, безразважныя і імпульсіўныя рашэнні на дадзеным этапе. Але ёсць факт, што іскі будуць», — цытуе міністра Delfi.

Марус Скуадзіс таксама адзначыў, што пасля таго, як юрысты вывучылі дагавор з «Беларуськалій» і прадугледжаныя ў ім абавязацельствы, стала зразумела: адказнасць за скасаванне кантракта і магчымыя фінансавыя наступствы ляжаць на праўленні літоўскай чыгуначнай кампаніі, якая знаходзіцца ў дзяржкіраванні.

9 жніўня ЗША, Канада і Вялікабрытанія ўвялі эканамічныя санкцыі супраць дзясяткаў беларускіх кампаній, уключаючы ААТ «Беларуськалій», якія набылі моц 8 снежня. Грузы «Беларуськалія» будуць праходзіць праз Літву да студзеня, заявіла 8 снежня кампанія Lietuvos gelezinkeliai. Паводле яе даных, прадпрыемства грузавых перавозак LTG Cargo, якое ўваходзіць у групу, у снежні павінна перавезці каля 1 мільёна тон угнаенняў. Па дагаворы з Lietuvos gelezinkeliai беларускі бок ужо загадзя разлічыўся за правоз гэтых грузаў.

Міністр замежных спраў Літвы Габрыэлюс Ландсбергіс падаў у адстаўку. Аб гатоўнасці пакінуць сваю пасаду з-за транзіту ўгнаенняў «Беларуськалія», які працягваецца праз Літву, таксама заявіў міністр камунікацый і транспарту Марус Скуадзіс. Прэм'ер-міністр Інгрыда Шыманітэ са свайго боку ўказала, што пакуль не прыняла рашэнне наконт адстаўкі міністраў.

Транзіт калійных угнаенняў «Беларуськалія» праз Літву не можа быць спынены, паколькі гэта ідзе ўразрэз з міжнароднымі пагадненнямі гэтай краіны, Еўрасаюза і ЗША. Аб гэтым заявіў Ігар Удавіцкі, найбуйнейшы акцыянер тэрмінала Biriu Kroviniu Terminalas у Клайпедзе, што спецыялізуецца на перавалцы беларускіх угнаенняў, паведамляе Delfi. «Ніякіх санкцый ЗША для транзіту беларускага калію праз Літву няма і быць не можа, таму што адносна транзіту як працэдуры прымяняць санкцыі нельга», — адзначаецца ў каментарыі Ігара Удавіцкага для агенцтва BNS.

Паводле яго слоў, для ўсіх дзяржаў, у тым ліку і для ЗША, абавязковыя міжнародныя дагаворы — пагадненне Сусветнай гандлёвай арганізацыі і Канвенцыя ААН па марскім праве. Яны гарантуюць свабоду транзіту для дзяржаў, якія не маюць выхаду да мора. «Зразумела, што і ЗША, і ЕС, якія ратыфікавалі гэтыя пагадненні, не могуць іх парушаць», — заявіў Ігар Удавіцкі. Акрамя таго, паводле яго слоў, літоўскі Сейм ратыфікаваў тры двухбаковыя пагадненні паміж Літвой і Беларуссю, якія ўстанаўліваюць свабодны рэжым грузавога транзіту праз Літву і Клайпедскі марскі порт.

Усё гэта пацвярджае, што ў Беларусі дастаткова сродкаў, каб зрабіць жыццё палітыкаў, якія ўводзяць санкцыі, крыху больш складаным. Пра гэта заявіў старшыня праўлення беларускага таварыства «Веды» Вадзім Гігін у эфіры «Альфа Радыё».

«Прэзідэнт цалкам зразумела гэта растлумачыў падчас інтэрв'ю Дзмітрыю Кісялёву. Мы будзем прымаць тыя меры, якія мінімізуюць наступствы санкцый для нашай краіны. У Беларусі дастаткова сродкаў, каб зрабіць жыццё палітыкаў, якія ўводзяць санкцыі, крыху больш складанымі. Гэта паказала перакрыццё паветранай прасторы Беларусі, спроба адмовы ад беларускай электраэнергіі. Цяпер Прыбалтыка зрабіла заяўку на дадатковую пастаўку электраэнергіі з Расіі і нашай краіны. Беларусь — гэта найбуйнейшы транспартна-лагістычны цэнтр, праз нас ідуць шматлікія патокі. Я ўжо не кажу пра калій і гэтак далей, мы можам бясконца пералічваць лінейку прадукцыі, без якой на Захадзе ў тым ліку не могуць абысціся. А Літва і Латвія ў значнай ступені з'яўляюцца эканамічна залежнымі ад нас дзяржавамі. Гэта датычыцца і Украіны», — сказаў эксперт.

Вадзіма Гігіна здзіўляе саманадзейнасць некаторых сапернікаў Беларусі. «Яны казалі, што цэны на газ не вырастуць. Яны думалі, што пасля чацвёртага пакета санкцый Беларусь нічога не зможа. Варта параўнаць прагнозы гэтых «аналітыкаў» аб тым, з якімі паказчыкамі наша эканоміка павінна была скончыць 2021-ы, і рэальныя лічбы», — падкрэсліў ён.

Тым часам стала вядома, што Беларусь сёлета ў студзені — кастрычніку павялічыла экспарт тавараў і паслуг у параўнанні з аналагічным перыядам летась на 32 працэнты — да 39,472 мільярда долараў. Аб гэтым сведчаць даныя Нацыянальнага банка. Думаю, усе каментарыі тут залішнія.

Пётр ДУНЬКО.

Медыяпрастора

Класічная журналістыка па новых каналах камунікацый

Фота БелТА.

Маладыя журналісты рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ ўчора сабраліся ў кангрэс-холе гасцініцы «Прэзідэнт-Гатэль» каб абмеркаваць тэндэнцыі сучасных медыя. VIII Форум маладых журналістаў прайшоў пад назвай «Традыцыйныя і новыя медыя: выклікі і магчымасці». Яго арганізатарамі выступілі Беларускі саюз журналістаў, Міністэрства інфармацыі і БРСМ. Падчас мерапрыемства выступоўцы распавядалі аб уласным прафесійным вопыце. Напрыклад, можна было даведацца аб журналістыцы краін Усходу або аб тым, як стварыць уласны брэнд у медыяпрасторы.

Падчас адкрыцця форуму **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** адзначыў:

— Гэта ўжо трэці медыйны форум сёлета. Усе яны накіраваны на рэформы, адукацыю ў першую чаргу. Бо наша галіна, як мы зразумелі летась, не трансфармавалася, але адстала. У гэтым плане мы крыху прайгралі і не паспелі адрэагаваць на тыя выклікі і пагрозы, якія ёсць у медыяспажыванні, у нашай краіне.

Звяртаючыся да маладых журналістаў, міністр параіў не палохацца сацыяльных праблем і ўсебакова, як мага аператыўна іх асвятляць. Супрацоўнікам рэгіянальных газет, што выходзяць адзін раз на тыдзень, Уладзімір Пярцоў прапанаваў дзяліцца навінамі ў сацыяльных сетках:

— Каб адказваць усім гэтым выклікам і праз новыя каналы камунікацыі праводзіць традыцыйную класічную журналістыку, праўдзівую, патрэба ў якой вельмі высокая, мы стараемся навучыць нашых спецыялістаў не толькі ў цэнтральных, але і, самае важнае, у рэгіянальных СМІ. Трэба гэта для таго, каб тое, што яны робяць, можна было прасоўваць далей, асабліва для моладзі, праз новыя сродкі масавай камунікацыі і інфармацыі.

Па словах Уладзіміра Пярцова, менавіта маладыя журналісты здольныя рухаць работу рэдакцый наперад, ствараючы новыя каналы для аператыўнай перадачы інфармацыі.

Першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ у сваю чаргу адзначыў:

— Упэўнены, што пляцоўка форуму дазволіць нам абмяняцца меркаваннямі, правесці змястоўныя дыскусіі, а таксама дасць новы імпульс для цяперашніх і будучых СМІ.

Падчас форуму былі ўручаны ўзнагароды маладым журналістам. **Аглядальнік газеты «Звязда» Валерыя СЦЯЦКО** стала лаўрэатам маладзёжнага творчага конкурсу «Дэбют» і атрымала дыплом у намінацыі «Найлепшы аглядальнік». Віншуем Валерыю з прафесійным дасягненнем!

Арына КАРПОВІЧ.

Моцныя рэгіёнамі

ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ НА НАС ПАГЛЯДЗЕЦЬ

Да пандэміі Ельскі раён Гомельшчыны быў асабліва папулярны сярод гасцей з Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі, Ізраіля і Галандыі. Цяпер яго адкрываюць для сябе айчынныя турысты

Пра тое, чым вабіць самы поўдзень Беларусі не толькі турыстаў, але і інвестараў, размаўляем са старшынёй Ельскага раённага выканаўчага камітэта Віктарам ЗАМОСЦІКАМ.

— Ельскі край — спакойны і вельмі ўтульны, з аўтэнтычнай культурай, магіяй глыбінкі Прыпяцкага Палесся. Калі прыязджаеш у раён, адчуваеш: людзі імкнуцца берагчы і шанаваць тое, што ёсць, але ўмеюць і пераймаць перадавы вопыт. Каму рады ў гэтым паўднёвым кутку Беларусі?

— Мы рады ўсім, хто хоча тварыць, будаваць, ствараць, спазнаваць, умее прымаць поспех і ведае цану спакойнага мірнага жыцця. Характэрна, што развіваецца нашаму краю шмат у чым дапамагаюць людзі, якія не па чутках ведаюць яго моцныя бакі. Гэта іх малая радзіма, і яны сваёй працай імкнуцца ўнесці ўклад у яе развіццё, зрабіць яе яшчэ больш прывабнай.

— Дык у чым жа сіла раёна?

— У людзях, вядома! Сёння ў Ельскім раёне пражывае 15 тысяч чалавек, амаль шэсць тысяч — вяскоўцы. У эканоміцы занята больш за 42 працэнты жыхароў, значная частка працуе ў сельскай і лясной гаспадарцы. Калі казаць пра вытворчы патэнцыял Ельшчыны, то гэта, безумоўна, дрэваапрацоўка. Развіваем вытворчасць мэблі, выпуск піламатэрыялаў і паліўнай дранкі. Прадукцыя пастаўляецца як на айчынны рынак, так і ў блізкае і далёкае замежжа. Гэтаму спрыяе добрая інфраструктура па дрэваапрацоўцы. Наша тэрыторыя прывабная для развіцця любога віду гаспадарчай дзейнасці развітой сеткай шляхоў зносін як рэспубліканскага, так і міжнароднага ўзроўню. Ёсць патэнцыял для развіцця аграрнага бізнесу. У нас дастаткова зямельных участкаў з добрай глебай. І ўжо ёсць выдатныя прыклады развіцця бізнесу па вырошчванні ягад, арэхаў, пладовых дрэў і кустоў.

— Раскажыце пра беларускія брэнды з прапіскай на Ельшчыне.

— «Ельскае крэсла» — сапраўды брэнд з паўвекавой гісторыяй. Былі часы, калі прадукцыю Ельскай мэблевай фабрыкі пастаўлялі па ўсім Савецкім Саюзе. Сёння прадпрыемства перажывае не самы лёгкі перыяд, але па-ранейшаму не саступае пазіцый найбуйнейшага беларускага вытворцы крэслаў і абедзенных сталоў з масіву дрэва. У вытворчасці выкарыстоўваюцца толькі натуральная драўніна, экалагічныя лакі і фарбы. Літаральна днямі ў Нацыянальным цэнтры маркетынгу і кан'юнктуры цэн прадстаўнікі Ельскай мэблевай фабрыкі прынялі ўдзел у дзелавых перагаворах з японскай бізнес-місіяй.

Ельскі брэнд — гэта і натуральныя плодаагароднінныя кансервы і сокі. Ельскі кансервавы завод у мінулым годзе адзначыў 70-гадовы юбілей. Паэтапнае тэхнічнае перааўзбраенне дае магчымасць прадпрыемству развівацца і займаць сваю нішу на рынку. Вырабляюцца кансервы з зялёнага гарошку, салаты, марынаваныя агуркі, падліўка, яблычнае павідла, розныя сокі і нектары. Уся прадукцыя вырабляецца з натуральнай сыравіны, без кансервантаў. Працуе на заводзе больш за 60 чалавек.

Асобна варта згадаць Ельскі лясгас. Яго доля ў выручцы ад усіх прадпрыемстваў раёна — больш за 40 працэнтаў. Штогод Ельскі лясгас пастаўляе на экспарт лесаматэрыялаў больш як на тры мільёны долараў. Рабочымі месцамі забяспечаны каля 400 чалавек.

З гэтым прадпрыемствам звязана рэалізацыя важнага інвестпраекта. Сёлета ў Ельскім лясгасе пасля мадэрнізацыі адкрыты ўчастак чыгункі, на якім можна адгружаць да 500 вагонаў у месяц.

— Сёлета Ельшчына дзялілася вопытам па развіцці агратурызму. Як улады спрыяюць пашырэнню прыватнай ініцыятывы ў гэтай сферы?

— Так, госці з розных куткоў Гомельшчыны цікавіліся станоўчымі прыкладамі работы па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны раёна. Пераканаліся, што варты ўвагі і вопыт Ельшчыны па ўкараненні новых формаў паслуг на маршрутах аграэкатурызму, папулярызацыі адкрыцця аграсядзіб сярод вясковага насельніцтва. Мы разглядаем агратурызм і як перспектыўны сацыяльны праект развіцця сельскіх тэрыторый, які садзейнічае занятасці насельніцтва. Сёння ў раёне працуе восем аграсядзіб, першая была адкрыта ў 2010 годзе. Дэпутатамі Гомельшчыны быў адзначаны станоўчы вопыт раёна па стварэнні кластараў аграгурызму, развіцці прыватна-дзяржаўнага партнёрства ў дадзенай сферы. Гэта вельмі важна з боку стварэння новых рабочых месцаў, якія адкрываюць самі людзі. Важнае і актыўнае ўключэнне ў гэтую работу аддзелаў культуры, спорту і турызму, адукацыі райвыканкама. Госці аграсядзіб не толькі адпачываюць, але і далучаюцца да культурна-пазнавальных праграм і мерапрыемстваў.

Прынамсі, «Ельшчына турыстычная» — яшчэ адзін перспектыўны брэнд тэрыторыі. Візітка раёна — рэгіянальны фестываль гарманістаў «Грай, гармонік!». Сёлета адзінаццаты раз ён сабраў больш чым трыста аматараў народнай творчасці з Гомельскай, Брэсцкай абласцей і Мінска.

Усё гэта яшчэ раз падкрэслівае, што Ельскі раён, нягледзячы на статус пацярпелага ад аварыі на ЧАЭС, прывабны для турызму. У гэтага кірунку таксама вельмі высокі патэнцыял для развіцця эканомікі раёна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Пекіне назвалі фарсам дыпламатычны байкот Алімпіяды

Дыпламатычны байкот, які абвешчаны шэрагам краін зімовым Алімпійскім гульням у Пекіне, з'яўляецца бескарысным мерапрыемствам, заявіў прадстаўнік МЗС КНР Ван Вэньбінь. «Спорт не мае нічога агульнага з палітыкай», — прыводзіць яго словы агенцтва Associated Press. Ван Вэньбінь нагадаў, што Кітай не адпраўляў запрашэнні ўладам ЗША, Канады і Вялікабрытаніі, а прысутнасць або адсутнасць іх афіцыйных асоб не паўплывае на поспех Алімпіяды. Пры гэтым ён выказаў упэўненасць, што за дыпламатычным байкотам Вашынгтона, Лондана, Атавы і Канберы ланцуговай рэакцыі ў свеце не будзе. «Цяпер незлічонае мноства кіраўнікоў дзяржаў, урадаў, членаў кіруючых сем'яў зарэгістраваліся для прысутнасці на зімовых Алімпійскіх гульнях у Пекіне, і мы ім рады», — сказаў Ван Вэньбінь. Як стала вядома, супраць дыпламатычнага байкоту Алімпіяды ў Пекіне выступіў прэзідэнт Францыі. Эмануэль Макрон заклікаў не палітызаваць алімпійскі рух.

У Мексіцы перакуліўся грузавік з мігрантамі, загінула больш за 50 чалавек

Грузавік з прычэпам, у якім знаходзіліся выхадцы з шэрагу краін Цэнтральнай Амерыкі, урэзаўся ў падпорную сцяну і перакуліўся ў раёне Ч'япа-дэ-Корса недалёка ад горада Тустла-Гуцьерэс, адміністрацыйнага цэнтра паўднёвага штата Ч'япас. У дарожна-транспартным здарэнні загінулі 53 чалавекі. Пра гэта гаворыцца ў апублікаванай заяве Генпракуратуры рэспублікі, паведаміла ТАСС. Прэзідэнт Мексікі Андрэс Мануэль Лопес Абрадор выказаў спачуванні родным і блізкім загінулых і распарадзіўся аказаць пацярпелым усю неабходную дапамогу. Для гэтага ў рэгіёне была накіравана рабочая група на чале з нацыянальным каардынатарам сіл грамадзянскай абароны Лаўрай Веласкес. Паводле папярэдніх звестак, мігранты з Гватэмалы і Гандураса меркавалі дабрацца да граніцы з ЗША. Губернатар Ч'япаса Руцілія Эскандон паведаміў, што ўлады правядуць уважлівае расследаванне абставін трагедыі. Прэзідэнт Гватэмалы Алехандра Джаматэі заявіў аб гатоўнасці дапамагчы з рэпатрыяцыяй цел загінулых.

Instagram абмяжуе доступ да сацсетак дзяцей да 13 гадоў

Пра гэта заявіў кіраўнік кампаніі Адам Мосэры ў Кангрэсе ЗША, паведаміла газета «Известия». «Мы ствараем шэраг опцый, каб правяраць, ці насамрэч чалавеку дастаткова гадоў, каб карыстацца Instagram. Мы ствараем новую тэхналогію, каб шукаць і выдаляць акаўнты тых, каму няма 13 гадоў. Таксама выкарыстоўваем тэхналогіі, каб зразумець, малодшыя або старэйшыя за 18 гадоў нашы карыстальнікі», — заявіў кіраўнік кампаніі. Акрамя таго, мяркуецца, што ў сакавіку Instagram запусціць першы набор элементаў кіравання для бацькоў і апекуноў. Новая прылада кантролю дазволіць бачыць, колькі часу падлеткі праводзяць у сацыяльнай сетцы, і ўсталёўваць часавыя рамкі. Улыбу Instagram аказаўся ў цэнтры ўвагі ў пачатку гэтага года, калі выданне The Wall Street Journal і кансорцыум медыяарганізацый апублікавалі серыю крытычных справаздач, заснаваных на ўнутраных дакументах. Яны раскрываюць, як сацыяльныя сеткі кампаніі наносяць шкоду псіхічнаму здароўю ўразлівых падлеткаў.

СА СТАЛІЦЫ — У ГЛЫБІНКУ

ЛАТКОВІЧАЎ ТУТ ПОМНЯЦЬ

Тэму падказаў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў на пасяджэнні прэзідыума, дзе абмяркоўвалі меры для скарачэння колькасці пустых дамоў. Ён пачуў гісторыю сям'і Латковічаў ад старшыні Докшыцкага райсавета Валенціны Рандарэвіч.

Паўлу і яго жонцы Надзі каля трыццаці гадоў. Сыну Івану тры годзікі, тата возіць яго ў садок у суседнюю вёску Параф'янава. Павел Латковіч працуе юрысконсультам Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Докшыцкага раёна, член маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Надзея працуе ў цэнтры па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый.

Дзед самага юнага жыхара Рапяхоў — Мікалай Аляксандравіч Латковіч — вядомы чалавек на Віцебшчыне. Працаваў галоўным архітэктарам у некалькіх раёнах, у тым ліку і Докшыцкім, дзе нарадзіўся Павел. На пенсію пайшоў з пасады начальніка галоўнага ўпраўлення праектных работ, горадабудаўніцтва і архітэктуры Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.

Павел — малодшы сын з чатырох у сям'і Латковічаў. З вялікай павагай распавядае пра бацькоў і братоў. Яго бацькі, дарэчы, пазнаёміліся на вяселлі ў Докшыцкім раёне, напэўна, лёсу трэба было вярнуць малодшага сына ў гэты край.

НЕ ПАГАНСТВА І НЕ БІЗНЕС

Увогуле, сталічныя перасяленцы ў глыбінку для Віцебшчыны — не дзіва. Сяліліся тут прыхільнікі новага рэлігійнага руху і шукальнікі лёгкіх заробкаў на турыстах.

— Не! Мы з жонкай не вегетарыянцы, — рассмяяўся Павел на мае здагадкі. — Пра турыстаў — не ўпэўнены, што гэта нам трэба, наадварот, мы пажадалі цішыні і жыць так, каб ні пад кога не падладжвацца, каб не было непрыемных нечаканасцяў ад тых, каго не ведаеш.

Да Рапяхоў Павел служыў у мінскай міліцыі. Ахоўваў парадак на чыгуначным транспарце. Пачынаў у патрульна-паставой службе, потым быў оперупаўнаважаным крымінальнага вышуку.

— Дарэчы, на сталічным вакзале працавала мая палавінка: білеты прадавала. Я сапраўды адразу адчуў, што яна мая! Як вам растлумачыць? Міма праходжу, гляджу на яе і не магу позірк адвесці. Бландзінка з вачыма як зоркі... — не хавае закаханасці мужчына.

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **23 декабря 2021 года в 10.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **13.12.2021 по 21.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Вольга БРЫЛОН:

«Гэтыя людзі вартыя таго, каб іх успомнілі»

Таямніцы беларускай эстрады

Напрыканцы восені ўбачыла свет кніга Вольгі Брылон «Беларуская эстрада. Настальгічны дывертысмент. Гісторыя эстрады Беларускай дзяржаўнай філармоніі. 1930—1980-я гады». Выданне, паколькі з'яўляецца першым даследаваннем тэмы, дае ўнікальную магчымасць згадаць перыяд, калі эстрада ў нашай краіне была багатай на адметныя падзеі і мела шырокую палітру для творчасці выбітных асоб, пра якіх мы і даведваемся са старонак кнігі. Напярэдадні прэзентацыі мы сустрэліся з аўтарам, музыказнаўцай Вольгай БРЫЛОН, каб распытаць пра сапраўдных творцаў, якіх варта памятаць і на якіх трэба раўняцца.

— Вольга Герцаўна, у сваёй новай кнізе «Беларуская эстрада. Настальгічны дывертысмент...» вы даследуеце пяцьдзясят гадоў гісторыі беларускай эстрады. Як узнікла ідэя правесці такую працу?

— Зацікаўленасць тэмай, безумоўна, была задоўга да таго, як я пачала пісаць кнігу. Думаю, каб займацца такой справай, трэба мець і душэўную цягу. Нядаўна пераглядала асабісты архіў і знайшла там сваю першую публікацыю 1987 года ў часопісе «Мастацтва» пра рок-музыку. А калі я працавала на радыё ў 90-я гады, то гэтая зацікаўленасць толькі ўзмацнілася. Менавіта там адбылося маё знаёмства з беларускай эстрадай і яе артыстамі, якіх часта можна было сустрэць у калідорах Дома радыё.

«Кіраўнікі філармоніі і прадстаўнікі Міністэрства культуры — яны літаральна, кажучы сучаснай мовай, займаліся прадзюсіраваннем таленавітых людзей. Варта было чалавеку заявіць пра сябе на нейкім конкурсе самадзейнасці, як адразу яго прыкмячалі і прапаноўвалі працу».

Разам з тым больш за 30 гадоў я ўжо працую ў Белдзяржфілармоніі. І тут таксама многіх артыстаў сустракала. Маё захапленне беларускай эстрадай пачалося з «Песняроў», а пасля адбылося больш глыбіннае вывучэнне іх творчасці, калі рабіла праграмы пра калектыў для эфіру. Важным паваротным момантам, думаю, можна лічыць і працу над папярэдняй кнігай «Уладзімір Мулявін і Лідзія Кармальская. Недаказанае...». Яе мы пісалі з дачкой Уладзіміра Георгіевіча Марынай. Яна запрасіла мяне дапамагчы ёй разабраць сямейныя архівы, лісты, перапіску бацькоў. У выніку выйшла кніга. Аднак хачу заўважыць, што для мяне заўсёды мае вялікае значэнне не толькі тэкст, але і яго візуальнае суправаджэнне. Таму, працуючы ўжо над «Беларускай эстрадай...», я разумела, што не магу аддаць свае напрацоўкі, тэкст і фатаграфіі ў рукі нейкага ўяўнага дызайнера. А паколькі ўжо быў вопыт супрацоўніцтва з высокапрафесійным майстрам дызайну Сяргеем Махавым, які афармляў наша папярэдняе выданне, то падумала, што новую кнігу магу рабіць толькі з ім і больш ні з кім. У мяне сабралася вялікая колькасць матэрыялу, які хацелася зрабіць даступным шырокай аўдыторыі. У тым ліку і таму было жаданне выказаць сваё эмацыянальнае стаўленне да творчых людзей таго часу, але каб зрабіць гэта лёгка і жыва, без сухой статыстыкі...

— Кніга ў вас мае прысвячэнне Ігару Паліводу...

— На жаль, яго ўжо няма ў жывых. Тое пакаленне вялікіх людзей ужо сыходзіць. Але мне пашчасціла сябраваць з ім і з яго сям'ёй. Ігар Пятровіч з 1959 да 1964 года працаваў мастацкім кіраўніком у Белдзяржфілармоніі, потым быў яшчэ дырэктарам Опернага тэатра, працаваў начальнікам упраўлення мастацтваў у Міністэрстве культуры... Гэтага чалавека памятаюць усе артысты старэйшага пакалення. Ён сам быў выбітным музыкантам і, як чалавек творчы, добра разумеў артыстаў. Ігар Пятровіч, паколькі бачыў маю зацікаўленасць беларускай эстрадай, аднойчы сказаў: «Вольга, калі вы не зробіце такую кнігу, то яе ніхто не напіша». І тая думка пачала жыць у маёй галаве. А потым, праз некалькі гадоў пасля выхаду першай кнігі, мне стала канчаткова зразумела, што трэба рэалізаваць задуманае. На шчасце, яшчэ ёсць людзі, якія могуць распавесці пра той перыяд. Некаторыя сустрэчы мне арганізоўвала Марына Мулявіна. Таксама працавала я ў архівах, сустракалася з родзічамі вядомых людзей. Увогуле, гэта вялікая справа, калі ты спачатку маеш проста пэўнае ўяўленне пра чалавека, а пасля чуеш аповеды пра яго ад яго дзяцей, блізкіх, трымаеш у руках яго фотаздымкі, афішы і так паступова пачынаеш бачыць карціну ва ўсёй паўнаце. Вобраз асобы нібы ўзнікае з туману. Галоўнае — усё робіцца з любоўю, а не проста зводзіцца да пералічэння падзей і фактаў. І першапачаткова я ставіла сабе мэту паказаць артыстаў так, каб імі зацікавіліся і захапіліся, бо мне важна абудзіць інтарэс да тых, хто несправядліва забыты. Гэтыя людзі вартыя таго, каб іх успомнілі і захавалі памяць пра іх.

«Маё захапленне беларускай эстрадай пачалося з «Песняроў», а пасля адбылося больш глыбіннае вывучэнне іх творчасці, калі рабіла праграмы пра калектыў для эфіру».

— Пад вокладкай адной кнігі вы сабралі неверагодныя біяграфіі і лёсы людзей, якія служылі мастацтву ў няпростых умовах. Што можна сказаць пра эстраду таго перыяду, калі глядзець на яе праз прызму грамадска-палітычных падзей?

— Я таксама неаднойчы думала пра тое, як людзі з трагічнымі лёсамі і ў складаных жыццёвых абставінах знаходзілі сілы тварыць. Мы ў параўнанні з імі — проста ніцыкі! Здаецца, дзякуючы гэтага пакалення былі словы «Устань і ідзі!». Яны ж перажылі жудасныя рэчы... Напрыклад, Ігар Пігулеўскі (акрабат, артыст арыгінальнага жанру) падчас вайны некалькі разоў трапляў у палон, але знаходзіў сілы збегчы адтуль. А Зінаіда Сысоева, якая засталася ў акупаваным Мінску адна з маці і сямігадовай дачкой (яе муж загінуў у Брэсцкай крэпасці ў першыя дні вайны), уладкавалася ў Мінскі гарадскі тэатр працаваць танцоўшчыцай. Пасля ж яе абвінавацілі ў супрацоўніцтве з немцамі і адправілі ў лагер. І пасля вайны страшных гісторый хапала. Піяніст Уладзімір Ніколаеў неяк у сяброўскай кампаніі сказаў, быццам у Германіі дарогі добрыя, і тут жа на чалавека напісалі данос і саслалі. А ў турме яму пераламалі ўсе пальцы. Аднак ён здолеў вярнуцца і аднавіцца, пасля працаваў у філармоніі... Людзі, нягледзячы ні на што, знаходзілі ў сабе сілы жыць: уставаць і ісці далей. Мужнае і гераічнае было пакаленне!

— Не менш уражваюць і факты перыяду «культуру ў масы», калі вы пішаце пра план, які павінны былі выконваць артысты: «840 канцэртаў у год, што складала 70 канцэртаў у месяц для трох брыгад... Найбольшую колькасць канцэртаў належала адпрацаваць у сельскай мясцовасці»...

— Было такое і ў 80-я гады. Зараз такую колькасць канцэртаў нам ужо складана ўявіць, а тады працавалі, прычым некаторыя нават «перавыконвалі план». Я вось успамінаю (гэта не мінскай філармоніі датычыцца, але больш вельмі распаўсюджана) з біяграфіі Мулявіна і Кармальскай: калі яны яшчэ жылі ў Томску, то з'язджалі на канцэртную сесію на некалькі месяцаў і рабілі там норму па канцэртнай дзейнасці з запасам, а потым адпачывалі. Такія былі тэмпы. Я нават з уласнага вопыту згадваю, як давалі ў дзень па шэсць канцэртаў! Але ўсё роўна тады было прасцей, паколькі артысты займаліся толькі творчасцю, а ўсе арганізацыйныя пытанні ўжо вырашаліся іншымі. Былі адміністратары, якія забяспечвалі артыстаў заробкам. А тыя, у сваю чаргу, прыязджалі да людзей і дарылі ім радасць і сапраўдныя эмоцыі. Калі гледачам прывозілі не толькі песні, але і танцавальныя, і акрабатычныя нумары, то гэта заўсёды запаміналася і выклікала вялікае захапленне.

— Калі звярнуцца да жанраў эстрады, то якія цяпер беззваротна страчаны?

— Вельмі шкада цыркавыя жанры. Яны ж заўсёды з'яўляюцца ўпрыгожваннем любага канцэрта. Але, на жаль, эстрадна-цыркавыя жанры страчаны. Цудоўныя некалі былі таксама ілюзіяністы і жанглёры. Я ў кнізе, напрыклад, апублікавала нарыс пра Анатоля Дудкіна, бліскучага майстра жангляжу. Быў таксама вялікі пласт артыстаў-канферансье (артысты размоўнага жанру). Яны ўсе былі розныя і па-свойму цікавыя. А гумар на канцэрце — важны складнік. Паглядзіце, як жартуе Максім Галкін. Ён інтэлектуал, і яго жарты, рэпрызы і пародыі зроблены на найвышэйшым узроўні. У гледача такое майстэрства заўсёды выклікае захапленне. У свой час артыстаў падобнага жанру было вельмі шмат, а вось сёння размоўны жанр і ўвогуле жанр пародый на беларускай эстрадзе практычна вымер. Засталіся ў асноўным толькі спевакі. Упэўнена, без падмурку пасляваеннай эстрады з яе разнастайнымі жанрамі не было б і «Песняроў», і іншых папулярных артыстаў.

— Ці можна сказаць, што падтрымка таленавітых людзей з боку Белдзяржфілармоніі спрыяла таму, паколькі яны раскрываліся ў творчасці?

— Гэта ўплывала, таму што кіраўнікі філармоніі і прадстаўнікі Міністэрства культуры — яны літаральна, кажучы сучаснай мовай, займаліся прадзюсіраваннем таленавітых людзей. Варта было чалавеку заявіць пра сябе на нейкім конкурсе самадзейнасці, як адразу яго прыкмячалі і прапаноўвалі працу. Згадаць хоць бы гісторыю калектыву «Чараўніцы», што спачатку ўзнік у Гродзенскім палацы культуры тэкстыльшчыкаў. «Чараўніцы» перамаглі на рэспубліканскім конкурсе «З песняй па жыцці», і тут жа Міністэрства культуры падрыхтавала глебу, каб забраць калектыў у Мінск.

«Неаднойчы думала пра тое, як людзі з трагічнымі лёсамі і ў складаных жыццёвых абставінах знаходзілі сілы тварыць. Мы ў параўнанні з імі — проста ніцыкі!»

— Але ўсё ж такі перш-наперш усё залежыць ад чалавека. На вашу думку, чаму сучасным эстрадным артыстам можна павучыцца ў папярэднікаў?

— У той час не было ў людзях такога прагматызму. Творчыя асобы — заўсёды ж на сваёй хвалі! Калі чалавек па-сапраўднаму захоплены творчасцю, то ўсё астатняе для яго другаснае. У беларускіх савецкіх артыстаў эстрады, пра якіх пішу ў кнізе, было значна больш альтруізму ў адносінах да працы і значна больш адказнасці за вынік. Але была і яшчэ адна, бадай, самая галоўная акалічнасць. Дзяржава ў асобе філармоніі давала артыстам прытулак, заробкі, планавала гастролі, забяспечвала рэкламу, шыла канцэртныя строі. Такія камфортныя ўмовы як нельга лепш спрыялі творчаму росквіту. А зараз артысты прадастаўлены самі сабе. Каб прабіцца, патрэбны прадзюсар і грашовыя выдаткі. Але сапраўдных АСОБ на эстрадзе мала. Бо галоўнае — талент, харызма і працаздольнасць, паколькі менавіта гэтыя якасці даюць сапраўдную любоў і прызнанне гледачоў — на шмат гадоў, а не на адзін дзень. Як гаварыў выдатны беларускі эстрадны спявак Эдуард Міцуль, «любы артыст павінен мець свой твар, інакш не варта выходзіць на сцэну»...

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва Вольгі БРЫЛОН.

P. S. *Прэзентацыя кнігі адбудзецца 14 снежня ў «Акадэмкнізе» ў 17.00. На мерапрыемстве вас чакае сустрэча з аўтарам Вольгай Брылон, сузаснавальнікам ВІА «Песняры», заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь Уладзіславам Місевічам і старэйшай дачкой «песняра» Марынай Мулявінай. Не прапусціце ўнікальную магчымасць пазнаёміцца з выданнем і яго стваральнікамі, а таксама пры жаданні набыць кнігу з аўтографамі.*

У лабірынтах мастацтва

ЯК ВАЛЬМЕН АЛАДАЎ АДПРАВІЎ ТРАКТАР НА ДАХ І ЎРАТАВАЎ РАЎБІЦКІ КАСЦЁЛ

Яго жыццё ўмясціла ў сябе амаль стагоддзе

Старэйшына мінскіх архітэктараў, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік Вальмен Мікалаевіч Аладаў пайшоў з жыцця на 92-м годзе.

Аладаў быў сынам Алены Аладавай, легендарнага дырэктара Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, і знакамітага кампазітара Мікалая Аладава. Ён нарадзіўся ў 1930 годзе ў Мінску. Дзіцем быў сведкам адкрыцця Карцінnай галерэі ў 1939 годзе, эвакуацыі з Мінска ў 1941 годзе, адраджэння Мінска ў 1950—1960-х гадах.

Бацькі марылі, каб стаў музыкантам, але ён выбраў (дзякуючы аднакласніку, сыну архітэктара Воінава) іншы шлях — архітэктара, у кім была на той час вялікая патрэба. Вучыўся ў Маскве, у Архітэктурным інстытуце, потым 10 гадоў працаваў пад кіраўніцтвам выдатнага беларускага архітэктара Георгія Заборскага. У 1965 годзе па ініцыятыве Вальмена Аладава быў створаны рэспубліканскі праектны інстытут «Белдзяржагіпрагандаль», якім ён кіраваў 15 гадоў.

КАМАРОЎКА

Хто з мінчан не ведае будынка крытага Камароўскага рынка, спарткомплексу ў Раўбічах, знакамітых кавярань 1980-х — «Малочнай» з пано з каляровага шкла, «На ростанях» на плошчы Якуба Коласа, інтэр'ераў універсамаў «Цэнтральны», «Фрунзенскі», «Серабранка», дома на вул. Казлова, на першым паверсе якога быў магазін «Акіян» з адметным «лускаватым» афармленнем інтэр'ера?

Найбольш вядомы праект з гэтых, аладаўскіх, — Камароўскі рынак, які быў пабудаваны ў 1979 годзе. За аснову меркавалася ўзяць праект гандлёвага цэнтра ў Чалябінску і маскоўскіх Чаромушках. Але архітэктары на чале з Аладавым пайшлі сваім шляхам і стварылі ўнікальную канструкцыю даху. Трэба было накрыць купалам гектар гандлёвай плошчы лёгкім зборным бетонным перакрыццём. Адзінае, што ўзялі з праектаў папярэднікаў, — напружаныя канаты, якія трымаюць абалонку і нацягваюцца дамкратамі...

Нявестка архітэктара Ірына Аладава ўспамінае яго расказы, як чыноўнікі сумняваліся, што такі агромністы шматтонны купал вытрымае ўзімку «снежную шапку» і не абваліцца.

«Я адказваю, што гэты дах можа знішчыць толькі атамная бомба», — гаварыў архітэктар. Але ад Аладава патрабавалі доказаў надзейнасці. І тады ён правёў такі «перформанс»: на купал рынку паднялі трактар, які праехаўся па даху. Паверылі.

Спачатку на фасадзе рынку былі беларускія арнаменты з металу, але пасля рамонту яны зніклі. Шкада, што не ўдалося ажыццявіць усё задуманае — быў запланаваны гатэль, павільёны сустрэчнага гандлю: прадаў прадукцыю і тут жа купіў прамтаварыы. Алімпіяда-80 прыспешвала здаць аб'ект у тэрмін. І ўсё роўна сёння Камароўка як сімвал «прадуктовага раю» стала адметным месцам Мінска.

АБЕДЫ БЕЗ ЧАРГІ

Час ставіў перад архітэктарамі амбіцыёзныя задачы. Раслі прадпрыемствы-гіганты. А як накарміць хутка і якасна цэлыя рабочыя змены на заводах, з тысячамі рабочых? Аладаў прыдумаў лінію раздачы ежы «Эфект» з падагрэвам, якая дзейнічае дагэтуль і патрабуе мінімум кухонных рабочых. Яна была ўвасоблена на «Гарызонце», МАЗе, Трактарным заводзе.

Камплектацыя абедаў на падносах на гэтай лініі ажыццяўляецца да прыходу спажыўцоў. Рабочыя заходзяць у залу адначасова, здымаюць са стоек-назапашвальнікаў падносы са стравамі (Аладаў жа ў ідэале прадугледжваў індывідуальны заказ). Пасля абеду ставяць падносы на ленту-канвеер, якая нясе посуд у пасудамыечную.

Па распрацаванай ім методыцы ў многіх гарадах былога Савецкага Саюза пабудаваны некалькі тысяч сталовых новага тыпу.

МІЖНАРОДНЫЯ ВЫСТАЎКІ

Вальмен Мікалаевіч меў авантурны характар, не баяўся рызыкаваць, быць першапраходцам. Калі ўсе праектныя інстытуты Мінска адмовіліся ад афармлення беларускіх павільёнаў міжнароднай выстаўкі ў Лейпцыгу («складана, адказна»), за іх узяўся «Белдзяржагіпрагандаль» пад кіраўніцтвам Аладава. Гэта была зусім не яго тэма, але супрацоўнікі натхніліся цікавай і новай задачай і выканалі праекты на высокім узроўні! Такім, што наступныя гады афармленне выставак дасягненняў народнай гаспадаркі Беларусі ў Лейпцыгу (1967), Плоўдзіве (1969), Мінску (1970), Маскве (1977) даручалі менавіта «Белдзяржагіпрагандлю».

РАЎБІЧЫ

Вальмен Мікалаевіч быў адказным за праектаванне спарткомплексу па біятлоне ў Раўбічах у сярэдзіне 1970-х і ганарыўся тым, што не толькі пабудаваў першы ў Еўропе спарткомплекс з трыбунамі гледачоў, кафэ, гатэлямі, але і выратаваў раўбіцкі касцёл. Першым даведаўся аб намеры зносу руін Крыжагорскага касцёла 1860-х. Своечасова папярэдзіў аб гэтым маці і супрацоўнікаў мастацкага музея, якія звярнуліся да Машэрава з прапановай аб рэстаўрацыі храма і арганізацыі ў ім Музея народнага мастацтва, што паспяхова і здзейснілася. Архітэктары-праекціроўшчыкі адрадзілі храм, зрабілі цудоўны інтэр'ер, вітражы ў выглядзе беларускіх посцілак і адметнае арыгінальнае музейнае абсталяванне з каштоўных парод дрэў, якое дзейнічае ўжо на працягу 45 гадоў.

МУЗЕЙ ЗАІРА АЗГУРА

Калі ў 1970-я сталі будаваць асобныя дамы-майстэрні для народных мастакоў, Аладаў сам прапанаваў спраектаваць такі дом для Заіра Азгура, які потым лёгка мог ператварыцца ў персанальны музей.

«Архітэктарам такога дома я бачу толькі цябе, Вальмен», — сказаў тады Заір Азгур. Разам выбіралі месца ў горадзе, дзе б мог стаяць такі дом. І выбралі — на Ляхаўцы, на вуліцы Трактарнай (зараз Азгура), на беразе Свіслачы, у цікім куточку горада. Домайстэрня быў пабудаваны ў 1984 годзе, Азгур працаваў тут апошнія 11 гадоў свайго жыцця. Гэта быў узорны дом-майстэрня, дзе ўлічана ўсё: і для прыватнага жыцця (кабінет, бібліятэка, вялікая гасцёўня для шматлікіх наведвальнікаў), і для працы (вялізарная майстэрня з высокімі столямі, фармовачная і г. д.). Нездарма сюды вадзілі шматлікія замежныя дэлегацыі, каб паказваць умовы жыцця савецкіх творцаў...

«У мяне ўзнікае адчуванне роднай хаты ў гэтай майстэрні», — казаў скульптар. Зараз гэты дом, былы філіял Нацыянальнага мастацкага музея, стаў асобным муніцыпальным мемарыяльным музеем-майстэрняй Заіра Азгура.

НАШЧАДКІ

Больш за 60 гадоў пражыў Вальмен Мікалаевіч са сваёй жонкай — Нінэль Іванаўнай, архітэктарам, прафесарам, спецыялістам па інтэр'ерах. Яны выхавалі дваіх сыноў. Малодшы, Вадзім Аладаў, стаў прафесійным мастаком, жыве і працуе ў Германіі. Яго персанальная выстаўка «Людзі і манекены» з поспехам прайшла ў 2004 годзе ў Нацыянальным мастацкім музеі ў межах святкавання 100-годдзя Алены Аладавай.

Разам з бацькам Вадзім аб'ездзіў амаль усе еўрапейскія краіны. Успамінае: «Бацька застыў перад саборам у Руане... «Што наша ўся сучасная архітэктура перад гэтым шэдэўрам — шкляныя скрынкі!»

Дарэчы, унучка, старшая дачка сына Андрэя, фізіка па прафесіі, Ксенія Місюра-Аладава стала рэстаўратарам ікон і графічных твораў, працуе ў Пушкіне пад Пецярбургам.

НАСТАЎНІК

У апошнія 30 гадоў Вальмен Мікалаевіч выкладаў у Беларускай політэхнічнай акадэміі (БНТУ) і, як успамінаюць яго вучні, нягледзячы на салідны ўзрост, быў «заўсёды ў тэме», выдатна валодаў камп'ютарнымі праграмамі.

«Вальмен быў інтэлігентам «найвышэйшай пробы, — успамінае Сяргей Сергачоў, кіраўнік кафедры БНТУ. — На пасяджэнне кафедры прыходзіў у парадным выглядзе з «гальштукам-матылём», як на свята. Яго імя, якое даў бацька-кампазітар, азначае «ясны розум». Ён меў ясную галаву да глыбокай старасці. У апошнія гады працы з-за яго ўзросту — амаль 90 — у кіраўніцтва былі сумненні з працягваннем кантракта. Калі надыходзіў час ісці ў аддзел кадраў, я ўважліва яго аглядаў: адбіраў кіёк (ён любіў з ім фасоніста хадзіць), здымаў любімую «дачную» кепачку. Вальмен Мікалаевіч усміхаўся, гаварыў камплімены — і кантракт заўседы працягвалі. Я разумеў, што без працы ён пачне хварэць. Яго жыццё — гэта праца».

У Мінску, у Фрунзенскім раёне, у мікраёне Дамброўка-6, ёсць вуліца Аладавых. І хоць яна прысвечана бацькам Вальмена Мікалаевіча, але гэта і яго вуліца, як прадстаўніка знакамітай мінскай творчай сям'і.

Вальмен Мікалаевіч пахаваны на Маскоўскіх могілках побач з бацькамі.

Надзея УСАВА,
вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.

НОВЫЯ КНІГІ АБ ПРЫРОДЗЕ І НЕ ТОЛЬКІ

У «Акадэмкнізе» прайшла прэзентацыя дзіцячых выданняў «Звязды»

Кніжныя крамы — гэта не толькі месца, дзе можна набыць выданні, але і пляцоўка для дыялогу паміж пісьменнікамі і чытачамі. Працягваючы добрую традыцыю сустрэч і прэзентацый, 9 снежня «Акадэмкніга» арганізавала мерапрыемства для падлеткаў. Школьнікі пазнаёміліся з сучаснымі беларускімі пісьменнікамі: Міхасём Пазняковым, Ірынай Карнаухавай, Інай Фраловай і Генадзем Аўласенкам, аўтарамі новых кніг для дзяцей і падлеткаў, што пабачылі свет у Выдавецкім доме «Звязда». Падчас сустрэчы можна было даведацца аб творчай біяграфіі аўтараў і задаць ім пытанні, нават вострыя. Напрыклад, аб самым вялікім ганарары.

— Адна з галоўных тэм у маёй творчасці — гэта радзіма, — распавёў Міхась Пазнякоў, аўтар кнігі «Канцэрт». — Я закранаю яе і ў дзіцячай, і ў дарослай літаратуры. Мужнасць нашага народа, прырода, мая родная Быхаўшчына — усё гэта мяне цікавіць.

Падчас прэзентацыі ўдзельнікі не забыліся наконт вялікай даты — 130-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Кожны з пісьменнікаў адзначыў, які вялікі ўклад у іх уласную творчасць унёс класік айчыннай літаратуры.

— Максім Багдановіч быў вялікім кніжнікам, — адзначыла Іна Фралова (яна прэзентавала свае выданні «Апельсин» і «Ромашки на асфальце»). — Ён вывучаў мову па слоўніках: у яго бацькі была вялікая бібліятэка. Але яму ніяк не давалася «дзеканне» і «цеканне». Мяркую, некаторыя з вас таксама часам робяць памылкі, размаўляючы на нашай мове. Калі нехта баіцца — не сумнявайцеся: нават у Багдановіча не адразу ўсё атрымалася. Таму раю вам не забывацца і размаўляць на роднай мове.

Ірына Карнаухава, аўтар кнігі «В царстве славного Байкала», параіла падлеткам не пужацца складанай літаратуры, а, наадварот, як мага глыбей з ёй знаёміцца:

— Мозг павінен працаваць. Чытайце складаныя кнігі і глядзіце пакуль не зразумелыя для вас стужкі: разважайце, размаўляйце адзін з адным — тады дасягняце пэўных вышынь у жыцці.

Генадзь Аўласенка, аўтар кнігі «Казкі дзядулі Дняпра», распавёў уласную гісторыю:

— Ведаеце, я пачаў пісаць позна — у 25 гадоў. А ў дзяцінстве захапляўся біялогіяй. Паступіў на біяфак, лавіў чмялёў па ўсёй Беларусі, увогуле, у нашай краіне іх 28 відаў. А потым нешта адбылося, і я пачаў займацца літаратурай. Мне камп'ютар дапамагае да гэтага часу — падкрэслівае памылкі. Вось і стаў я не біёлагам, а літаратарам. Пішу дарослую фантастыку і дзіцячыя казкі.

Напрыканцы сустрэчы аўтары пажадалі школьнікам як мага больш чытаць і цікавіцца сучаснай беларускай літаратурай.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению производственного унитарного предприятия «Гомельский завод металлоконструкций» ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице управляющего в деле о банкротстве Насонова В. В., извещает о проведении 27 декабря 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 310/С-38217** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **погрузо-разгрузочная площадка.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/1. **Капитальное строение с инв. № 310/С-38218** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **погрузочная площадка.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000377,** общая площадь **0,5901 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4. **Капитальное строение с инв. № 310/С-29449** общей площадью **10,0 кв. м,** назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – **кислородная.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/7. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000373,** общая площадь **0,0032 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4	**87 210,00**	4 360,50	8 721,00
2	**Капитальное строение с инв. № 310/С-38220** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **подкрановая эстакада.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000374,** общая площадь **0,3200 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4. **Капитальное строение с инв. № 310/С-29451** общей площадью **105,4 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **гараж.** Адрес: Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4/16. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321083603601000379,** общая площадь **0,0523 га (право аренды). Адрес:** Гомельская обл., Гомельский р-н, Зябровский с/с, п. Кореневка, ул. Зеленая, 4	**52 740,00**	2 637,00	5 274,00

Продавец: унитарное предприятие «Гомельский завод металлоконструкций», г. Гомель ул. Жарковского 24, каб. 3-7.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.: 8 (029) 616-39-07 – главный инженер Леонид Петрович (осмотр недвижимости и территории), 8 (029) 835-67-42 – управляющий в деле о банкротстве Насонов Владимир Валерьевич, 8 (033) 634-86-95 – юрисконсульт Насонов Николай Владимирович.

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/сBY52BLBB30120400071204001001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 декабря 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 23 декабря 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** с момента его подписания, **если иное не предусмотрено собранием (комитетом) кредиторов должника**. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части)» и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.08.2021 г. № 157 (29526).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91» (Продавец)

Лот № 1: ГРУЗОВОЙ СПЕЦИАЛЬНЫЙ АВТОКРАН LIEBHERR LTM 1160-5.1, кузов (рама) W09585200EEL05360.

Начальная цена с НДС – 1 879 530,00 руб. Задаток – 187 953,00 руб. Обременения: залог. Шаг аукциона – 1 %.

Местонахождение лота № 1: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17. Штраф – 30 000,00 руб.

Аукцион состоится 29.12.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **27.12.2021 в 11.00**.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Борисовхлебпром» (Продавец)

Лот № 1: ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, инв. № 612/С-3847, 258,9 кв. м, Минская обл., г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 1Д.

Обременение: аренда (информация на сайте ino.by).

Земельный участок 641300000003001262, 0,1124 га, (право аренды по 15.04.2041). Начальная цена с НДС – 249 770,88 руб. Задаток – 24 977,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 30.12.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **28.12.2021 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации № 91»

Лот № 1: ПОМЕЩЕНИЕ ТРАНСПОРТНОГО НАЗНАЧЕНИЯ с инв. № 500/D-708117116, 479,5 кв. м, адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 48Б-2.

Обременение: аренда (информация на сайте ino.by).

Начальная цена с НДС – 218 885,00 бел. руб.

Задаток – 21 888,50 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 29.12.2021 в 09.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **27.12.2021 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский домостроительный комбинат» (продавец) извещает о проведении 12 января 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
1	**Барабан сушильный**	**22 800,00**	**4 560,00**
Адрес: Гомельская обл., Петриковский район, Мулявровский с/с			

Продавец: ОАО «Гомельский домостроительный комбинат», г. Гомель, ул. Лазурная, 17. Контактный телефон +375 (44) 519-19-96.

Шаг аукциона – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца: р/с BY12BLBB30120400071166001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК BLBBBY2X, УНП 400071166.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни **с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10.01.2022 г. в 17.00.**

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом (ИП) РБ – копии свидетельства о государственной регистрации юр. лица (ИП), устава юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность; представителем физ. лица (ИП) РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, физ. лица, ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет 31, 32, 33 стр. паспорта, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) банковских дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **20 (двадцати) банковских дней** с даты объявления участника победителем аукциона. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости объекта. Аукцион проводится в соответствии с Положением ООО «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Капитальное строение с инвентарным номером 720/С-12317, расположенное по адресу: Могилевская область, Горецкий район, Ленинский с/с, аг. Ленино, ул. Ленина, 8**
Начальная цена продажи	40 439,04 руб. (сорок тысяч четыреста тридцать девять рублей 71 копейка), в т. ч. НДС 20 % – 78 697,45 руб. (семьдесят восемь тысяч шестьсот девяносто семь рублей 04 копейки)
Сумма задатка	2021,95 (две тысячи двадцать один рубль 95 копеек) – 5 %
Открытый аукцион состоится	**09.01.2022 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 08.01.2022 г. включительно по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, д. 3, второй этаж, кабинет 209
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта
Контактные данные	По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222) 632792, моб. 8029-169-39-68

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 2021,95 белорусского рубля на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – **9 января 2022 г. с 10.30 до 10.55.** В случае нерегистрации в вышеназванное время участник не допускается к участию в аукционе. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 40 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

І ГЭТА ЎСЁ — МАЁ?

Пагаворым аб праблемах атлусцення

Чаму з гадамі мы таўсцеем? Таму што ўзрост і змагацца з «прыродай» бессэнсоўна? Ці сапраўды з часам у нас замаруджваецца абмен рэчываў, што спрыяе набору кілаграмаў? Як лішняя вага шкодзіць нашаму здароўю? Чаму з ёй звязаны такія праблемы, як высокі артэрыяльны ціск і іншыя сардэчна-сасудзістыя хваробы, цукровы дыябет 2 тыпу і нават анкалагічныя ўтварэнні? Ці можна, пахудзеўшы, перазапусціць арганізм і пазбавіцца многіх балячак? Пра гэта мы разважаем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГУРБАНІДЖАДАМ.

— Доктар Гумен, прынята лічыць, што з узростам абмен рэчываў у нашым арганізме замаруджваецца, і ад гэтага кілаграмы адкладваюцца куды хутчэй, чым у маладосці...

— Сапраўды, з гадамі ў нас павялічваецца вага: растуць жывот, сцёгны, павялічваецца падскурная тлушчавая клятчатка. Мы прызвычаіліся звязваць гэта з узростам і лічым, што чым больш нам гадоў, тым марудней абмен рэчываў. І ёсць захворванні, якія з'яўляюцца з узростам: павышаны артэрыяльны ціск, болі ў суставах, некаторыя жаночыя хваробы, анкалагічная захвараль насць. І часта можна пачуць такое апраўданне: «А ты ведаеш, колькі мне гадоў?»

Аднак апошнія даследаванні вучоных, адно з якіх апублікавана ў часопісе Scienc, паказалі, што гэта не так. Асноўны абмен (які, як мы думаем, з узростам пачынае мяняцца) — гэта энергія, што патрэбна нашаму арганізму ў пакоі, каб ён працаваў. Каля 60 % энергіі асноўнага абмену забіраюць галаўны мозг, печань, сэрца і ныркі. Як ні дзіўна, разам яны складаюць усяго каля 5 % масы нашага цела, але патрабуюць вельмі шмат энергіі. Даследаванне цягнулася некалькі дзесяцігоддзяў, падчас яго вымяралі асноўны абмен у розных людзей: ад немаўляці да прадстаўнікоў сталага веку.

Вучоныя высветлілі, што ў дзяцей да года метабалізм паскораны на 50 % у параўнанні з дарослым. З аднаго года да 20 ён змяншаецца на тры працэнты штогод. З 20 да 60 гадоў асноўны абмен застаецца нязменным. І не залежыць ні ад полу, ні ад цяжарнасці, клімаксу ці іншых станаў. Пасля 60 гадоў ён пачынае змяншацца на 0,7 % у год. Такім чынам, у 20 гадоў і 60 у чалавека абмен рэчываў прыкладна аднолькавы. Гэта пацвярджае назіранне, што павелічэнне вагі з узростам больш характэрна для развітых краін, дзе людзі багацейшыя і больш могуць сабе дазволіць. Такое атлусценне ў медыцыне мае назву метабалічнага сіндрому.

«Калі хлопца-школьніка ці студэнта паклікаць гуляць у футбол, ён прабегае паўдня і не ўспомніць пра ежу. А дарослага мужчыну, калі ў яго змяніўся лад жыцця, яшчэ паспрабуй выцягнуць у спартыўную залу!»

— Ці азначае гэта, што пачынаючы з 20 гадоў усё жыццё можна пражыць у адной вазе, скажам, 55 кілаграмаў?

— Нават крыху менш, бо пасля 30 гадоў змяншаецца мышачная маса, а ўсё, што мы набіраем, — гэта тлушч. Мы павялічваемся ў памерах ад добрага жыцця. У краінах Афрыкі такой праблемы не назіраецца, а вось у ЗША каля 40 % насельніцтва мае атлусценне, там праблема набыла нацыянальны маштаб. З-за гэтага змяншаецца працягласць жыцця. Праўда, тыя амерыканцы, якія маюць больш высокі сацыяльны статус, сочаць за сваёй фігурай, стараюцца менш есці, не ўжываюць генна-мадыфікаваную ежу, фастфуд.

— Метабалічны сіндром адносіцца да тых хвароб, якія «не баляць»?

— Сапраўды, гэта так, і, на вялікі жаль, людзі звяртаюцца да доктара толькі тады, калі атрымліваюць ускладненні. Чалавек звычайна ні на што ні скардзіцца, не ідзе да ўрача і, што самае цікавае, істотна патаўсцеўшы, можа адчуваць сябе лепш. Прычым трэба заўважыць, што метабалічны сіндром — праблема не толькі дарослых, але і дзяцей.

— Як яго ў сябе западозрыць?

— Метабалічны сіндром характарызуецца павелічэннем акружнасці таліі (больш за 102 см у мужчын і 88 см — у жанчын), гіпертаніяй (больш за 130/85 мм рт. сл.), павелічэннем узроўню глюкозы нашча (больш за 5,6 ммоль/л), зменай адчувальнасці клеткі да інсуліну (трыгліцэрыды больш за 1,7 ммоль/л), змяненнем суадносін дрэннага і доўгага халестэрыну (менш за 1,04 ммоль/л для мужчын і 1,29 для жанчын). Калі хоць бы тры з гэтых умоў выконваюцца, тады можна ставіць метабалічны сіндром. І ўсё гэта наступствы атлусцення. Прычым тут няважна, якую ежу мы ўжываем — карысную ці шкодную, самае галоўнае — калорыі, якія атрымліваем. Калі іх колькасць перавышае норму, якую арганізм расходуе, то мы крок за крокам набліжаемся да метабалічнага сіндрому.

— Ці можна гэты працэс адкруціць назад, калі сесці на дыету і есці менш?

— Усё залежыць ад таго, на якім этапе метабалічнага сіндрому мы пачынаем страйнець. Ціск у некаторых выпадках можа ўрэгулявацца. Але ёсць і незваротныя змяненні: напрыклад, у сценках сасудаў, якія становяцца менш эластычнымі, на іх адкладваюцца халестэрынавыя бляшкі. І калі чалавек пахудзее, яму стане лягчэй: зменшыцца нагрузка на суставы і пазваночнік, сэрцу будзе палёгка. Але змяненне сасудаў і бляшкі застануцца, лекаў ад гэтага няма. Таму лепш спыняць метабалічны сіндром у самым пачатку.

— Чым небяспечны метабалічны сіндром?

— Атлусценне — гэта праблема, якая расце марудна, але прыводзіць да пэўных сур'ёзных хвароб. Мы ўжываем калорый больш, чым расходуем, і пачынаем набіраць вагу. Гэта адбываецца па двух сцэнарыях. Ёсць людзі, якія таўсцеюць, і гэта адразу заўважна, а ёсць тыя, якія, здаецца, і не моцна набралі, але вагі паказваюць больш, чым можна падумаць. У іх пераважна развіваецца ўнутраны тлушч. І гэты тлушч якраз запускае ўсе негатыўныя працэсы.

Унутраны тлушч нам насамрэч патрэбны. Ён падтрымлівае нашы органы, сагравае іх, бо працуе як тэрмаізаляцыя, амартызуе ўдары. Але праблемы пачынаюцца, калі гэтага тлушчу становіцца зашмат.

Людзі таўсцеюць па двух тыпах: або «яблык», або «груша». Фігура першага чалавека нагадвае шар, тлушч адкладваецца ў раёне таліі, другога — грушу, бо тлушч пераважна назапашваецца ў ніжняй частцы. Першы тып больш небяспечны.

Калі суадносіны акружнасці таліі да росту ў жанчын перавышаюць 0,48, а ў мужчын — 0,52, можна казаць пра атлусценне і пачатак праблемы. Ёсць, канешне, людзі, у якіх пачынае расці падскурная клятчатка, а не ўнутраны тлушч, у іх метабалічны сіндром развіваецца больш марудна. Ёсць людзі з атлусценнем, а метабалічны сіндром у іх не назіраецца, але гэта рэдкасць і выключэнне з правіла.

Што адбываецца пры метабалічным сіндроме? У арганізме назапашваецца вялікая колькасць унутранага тлушчу. У ім ускладнены кровазварот, і з-за гэтага тлустыя клеткі пачынаюць дыстрафіравацца і адміраць. У гэты час стымулюецца імунная сістэма, выпрацоўваюцца запаленчыя інтэрлекіны. Яны з'яўляюцца асноўнай прычынай хранічнага запалення ў нашым арганізме. Інтэрлекіны пачынаюць распаўсюджвацца па ўсім арганізме, выклікаючы розныя праблемы: ад сардэчна-сасудзістых і цукровага дыябету 2 тыпу да анкалагічных і аўтаімунных. Гэта і нейрадыстрафічныя змяненні, такія як дэменцыя і хвароба Альцгеймера. Акрамя таго, унутраны тлушч трапляе ў печань, выклікае тлушчавую дыстрафію, што, у сваю чаргу, запускае многія працэсы ў нашым арганізме. Тлушч можа назапашвацца паміж рознымі мышачнымі валокнамі і такім чынам памяншаць адчувальнасць клетак да інсуліну, што ў далейшым прывядзе да цукровага дыябету 2 тыпу. Аслабляецца імунная сістэма, могуць узнікаць розныя анкалагічныя хваробы, напрыклад рак эндаметрыю і малочных залоз у жанчын, рак прастаты ў мужчын, а таксама рак стрававода, кішэчніка. Канешне, гэта нельга спісваць толькі на атлусценнне, уплываюць і канцэрагенныя фактары, і генетычныя. Аднак метабалічны сіндром — дадатковае масла ў агонь.

Пры атлусценні паступова пачынаюцца атэрасклератычныя змяненні сценак сасудаў. З'яўляюцца атэраскератычныя бляшкі, яны ўплываюць на тромбаўтварэнне, што прыводзіць да інсульту і інфаркту. Змяняюцца самі сценкі сасудаў — становяцца грубымі і неэластычнымі, што прыводзіць да павелічэння артэрыяльнага ціску. Лішняя вага можа ўплываць на работу нырак, падстраўнікавай залозы, печані — яны павялічваюцца ў аб'ёме. Дадатковыя кілаграмы могуць быць прычынай кістозных утварэнняў яечнікаў. У мужчын змяншаецца ўзровень тэстастэрону і аслабляецца патэнцыя, у жанчын таксама можа развівацца фрыгіднасць. Усё гэта дае вялікі штуршок да павелічэння біялагічнага ўзросту чалавека.

«Чым больш мы ўжываем ежы, тым лепш для кампаній, якія вырабляюць харчовыя прадукты. Ім не выгадна, каб мы мала елі і набывалі менш прадуктаў».

І, на жаль, людзі звяртаюцца да доктара, як правіла, толькі тады, калі атрымалі гэтыя ўскладненні: ішэмічную хваробу сэрца, інфаркт, мікраінсульт, цукровы дыябет, гінекалагічныя хваробы, болі ў суставах.

Ёсць некаторыя эндакрынныя генетычныя захворванні, якія вядуць да атлусцення, як, напрыклад, хвароба Кушынга, але яны сустракаюцца не так часта. І такім людзям патрабуецца сур'ёзная медыцынская дапамога, ад дыеты яны не худзеюць. Калі чалавек супакойвае сябе і кажа, што такая ў яго генетычная схільнасць, часцей за ўсё гэта не так.

— Нягледзячы на тое што абмен рэчываў аднолькавы з 20 да 60 гадоў, мяняецца гарманальны фон, у прыватнасці ў жанчын падчас цяжарнасці і клімаксу. Кажуць, што гэта спрыяе набору кілаграмаў.

— На асноўны абмен гэта не ўплывае, і ў даследаванні гэта было адзначана. Гармоны — прагестэрон і эстраген у дадзеным выпадку — ніяк не ўплываюць на абмен рэчываў. Варта проста сачыць за сабой.

— Але з чым тады звязана, што ў маладосці многія з нас больш худыя, чым ва ўзросце?

— З тым, што мы становімся больш лянівымі. Арганізм прывыкае атрымліваць хуткае задавальненне ад ежы, а мы менш рухаемся. Калі хлопца-школьніка ці студэнта паклікаць гуляць у футбол, ён прабегае паўдня і не ўспомніць пра ежу. А дарослага мужчыну, калі ў яго змяніўся лад жыцця, яшчэ паспрабуй выцягнуць у спартыўную залу! У маладым узросце і дзяўчаты больш актыўныя. А, седзячы дома з дзецьмі, таўсцеюць, бо малое трэба карміць шмат разоў на дзень, але яно з'ядае адну лыжку кашы, а мама — усю талерку. А потым апраўдваюць свой стан цяжарнасцю і родамі. Ды і многія, замест таго каб шукаць праблему ў сабе, знаходзяць апраўданні — у цяжарнасцях, узросце. Людзі ахвотна называюць свой узрост, але нікому не хочуць паказваць, колькі з'ядаюць на абед ці вячэру.

— Як змагацца з метабалічным сіндромам?

— Любую хваробу лягчэй папярэдзіць, чым лячыць. Але калі мы ведаем, што з узростам наш абмен рэчываў амаль не мяняецца, а атлусценне нязменна прывядзе да метабалічнага сіндрому, то мы мусім рабіць выбар. Што нам у жыцці больш важна: здароўе ці лад жыцця, які вядзём, і тое задавальненне, якое атрымаем ад ежы? Доктар, дарэчы, таксама мусіць быць прыкладам. Калі ён сам ледзь змяшчаецца за сталом, то яго парады наўрад ці будуць пачуты пацыентам.

Калі мы прыйшлі да метабалічнага сіндрому, варта зменшыць колькасць калорый, якія паступаюць у арганізм. Мы можам есці шмат, але павінны ўрэгуляваць калорыі. Калі колькасць калорый перавышае той узровень, які мы расходуем, яны ідуць у скарбонку метабалічнага сіндрому. Калі мы ядзім шмат некаларыйнай ежы, то проста расцягваем страўнік, але вялікіх крокаў да метабалічнага сіндрому не робім.

Час ад часу можна прымаць медфармін — гэта таблеткі, якія павялічваюць адчувальнасць клетак да інсуліну. Такім чынам, мы змагаемся з павелічэннем узроўню інсуліну ў арганізме і затарможваем працэс развіцця метабалічнага сіндрому. Фізічная нагрузка таксама мае значэнне.

— Ці можа дапамагчы хірургічнае выдаленне тлушчавых адкладаў або ліпасакцыя ў барацьбе з метабалічным сіндромам?

— На жаль, гэта не выратоўвае. Ліпасакцыя змяншае нагрузку на пазваночнік, суставы ног, бо вага становіцца меншай. Але з метабалічным сіндромам такім чынам мы змагацца не можам, бо асноўная праблема — вісцэральны тлушч унутры арганізма. Ліпасакцыямі ад яго не пазбавішся — тут трэба худзець самастойна.

Метабалічны сіндром — хвароба развітых цывілізацый, тых, хто можа дазволіць сабе шмат есці. І на гэта працуе цэлая індустрыя, у тым ліку і рэкламная. Чым больш мы ўжываем ежы, тым лепш для кампаній, якія вырабляюць харчовыя прадукты. Ім не выгадна, каб мы мала елі і набывалі менш прадуктаў. Адсюль і шмат тэлепраграм: што з'есці, каб пахудзець. Але тут правіла іншае: для таго каб пахудзець, варта менш есці.

— Худзізна — залог здароўя?

— Калі паглядзець на доўгажыхароў, якім пад сто гадоў ці нават больш, сярод іх няма тоўстых. Канешне, на працягласць жыцця ўплывае і ген доўгажыхарства, але сярод тых, каму пад 100 гадоў, нама людзей з вялікай вагой.

Алена КРАВЕЦ.

З ДЗЕДАМ МАРОЗАМ, ЗІМНІКАМ І ЗАВІРУХАЙ...

Якія рэзідэнцыі казачных персанажаў Гродзенскай вобласці варта ўключыць у свае навагоднія туры

Першая з іх расчыняе свае дзверы ў суботу, 11 снежня. Мяркуецца, што ўсяго навагодніх сядзіб будзе не менш за 13. У некаторых ёсць вядомыя адрасы. Напрыклад, сядзіба Дзеда Мароза на Аўгустоўскім канале альбо ў Гродзенскім цэнтры рамёстваў. Цікава, што акрамя Дзядоў Марозаў дзяцей будуць сустракаць у сваіх рэзідэнцыях Дзед Зімнік з Бабай Завірухай, а таксама Берест-Зюзя са спадарыняй Завеяй.

З кожным днём атмасфера навагодніх свят усё больш адчувальная. На плошчах стаяць упрыгожаныя ялінкі, будынкі і вітрыны зіхацяць агеньчыкамі і навагоднімі атрыбутамі. У кожным раёне рыхтуецца святочная праграма. Некаторыя падзеі ўжо сталі традыцыйнымі. Напрыклад, калядны кірмаш у Гродне. Ён пачаў работу на гэтым тыдні, а па суботах тут яшчэ будуць ладзіць канцэрты. Зіхаціць каляровымі агеньчыкамі алея дызайнерскіх ёлак ад арганізацый і прадпрыемстваў горада, а гродзенцы чакаюць казачнае шэсце Дзядоў Марозаў і Снягурак у абласным цэнтры.

Але галоўнымі падзеямі можна лічыць адкрыццё рэзідэнцый навагодніх персанажаў. Як правіла, многія з іх месцяцца ў лясных зонах, што стварае казачную атмасферу.

Сваю работу сядзібы Дзядоў Марозаў і Снягурак пачнуць з сярэдзіны месяца, першымі сустрэнуць дзяцей у Навагрудскім раёне, каля маляўнічага возера Свіцязь. Як расказала **дырэктар Навагрудскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Наталля КАВАЛЬСКАЯ**, казачная рэзідэнцыя расчыніць свае дзверы 11 снежня і будзе працаваць на базе эколага-інфармацыйнага цэнтра кожныя выхадныя, а ў астатнія дні тыдня па заяўках. За чатыры гады адзіная ў раёне сядзіба стала даволі папулярнай: сюды прыязджаюць не толькі жыхары Навагрудчыны, але і іх суседзі. Таксама былі групы з Брэсцкай, Мінскай, Віцебскай абласцей. У рэзідэнцыі прымаюць не толькі групы, але і сем'і, якія вырашылі ўключыць наведванне Дзеда Мароза ў свае навагоднія туры.

— Кожны год мы распрацоўваем новыя праграмы, усе персанажы — нашы работнікі культуры, — паведаміла Наталля Кавальская. — Сёлета, напрыклад, будзе прадстаўлена дэтэктыўная гісторыя з удзелам мясцовага рыцарскага клуба, які выйшаў на пошукі Снягуркі. Яшчэ ў нас на базе цэнтра рамёстваў адкрылася майстэрня Дзеда Мароза, дзе кожны ахвотны пад кіраўніцтвам вопытных майстроў можа зрабіць атрыбуты свята, сувеніры да Новага года. Дарэчы, касцюмы для казачных персанажаў мы прыдумваем і шыем самі.

Свайго роду брэндам Іўеўскага раёна стала сядзіба Дзеда Зімніка і Бабы Завірухі ў вёсцы Залейкі. Сёлета тут пачнуць адзінацаты навагодні сезон.

— Скажыце, у вас снег выпаў? Гэта наш гном лясны сваю падушку ўзбіваў, ад таго і снег пайшоў.

Так пачалася наша размова з **намеснікам дырэктара Іўеўскага цэнтра культуры і вольнага часу Наталляй МУДРЫК**, якая расказала аб новай праграме навагодніх прыгод у Залейках. Фабулы казачных пастановак кожны год розныя. Сёлета будзе квэст па лесе ў пошуках меха з падарункамі, які згубіўся. Парадуюць і новыя персанажы, напрыклад, панда. За даволі працяглы тэрмін існавання сядзібы яна набыла папулярнасць і нават уключана ў маршруты турыстычных фірмаў. А адкрыюць чарговы сезон 18 снежня члены ветэранскай арганізацыі гарадскога пасёлка Воранава, якія прыедуць сюды са сваімі ўнукамі.

Усе ўдзельнікі казачнага падарожжа атрымаюць сувеніры, зробленыя мясцовымі майстрамі. Зімнік абавязкова пачастуе гарачай гарбатай.

— Наша казачная пляцоўка размешчана ў лесе, тут і ёлку ўпрыгожваем. Ёсць домік са сцэнай, вароты, розныя аб'екты, напрыклад, прытулкі Бабы Ягі, калодзеж жаданняў, паляна 12 месяцаў, — зазначыла Наталля. — Вядома, было б нядрэнна, калі б тут з'явіўся сапраўдны ўтульны дом, але гэта пакуль толькі мары.

А вось рэзідэнцыя ўладарою зімы Зюзі і спадарыні Завеі размясцілася ў аздараўленчым лагеры, што ў Бераставіцкім раёне. Як расказала **дырэктар раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Юлія АТРУШКЕВІЧ**, Зюзя — персанаж не прыдуманы, а ўзяты з беларускай міфалогіі, дзе ён — гаспадар зімы. Ён у нечым падобны на Дзеда Мароза: такі ж стары і з доўгай барадой. Але адзеты значна прасцей — у звычайны кажушок. Дарэчы, ёсць павер'е, што на Каляды беларусы першую лыжку кучці кідалі яму ў акно, каб маразы сцішэлі.

Фота grodnonews

Калі некалькі гадоў таму ўзнікла ідэя стварыць навагоднюю рэзідэнцыю, арганізатары вырашылі, што традыцыйных персанажаў і так хапае, а вось Зюзя будзе адзіны на ўсю Гродзенскую вобласць. Прычым ад Дзядоў Марозаў і Снягурак тут таксама не адмовіліся — яны прысутнічаюць на прадстаўленнях і дораць падарункі. За перыяд работы рэзідэнцыі відавочна, што попыт на анімацыйныя праграмы высокі. На тэрыторыі стацыянарнага летніка абсталявана шэсць інтэрактыўных пляцовак, дзе гасцей сустракаюць самыя розныя міфалагічныя героі з гаспадыняй Завеяй. У рэзідэнцыі частуюць гарачымі стравамі і гарбатай. На выстаўцы-кірмашы можна набыць унікальныя сувеніры, зробленыя з прыродных матэрыялаў. Месца сядзібы зручнае для турыстаў, бо знаходзіцца на шляху да Белавежскай пушчы.

Адрасамі некаторых рэзідэнцый сталі базы лясных і паляўнічых гаспадарак. А вось у Ашмянскім раёне такая сядзіба размясцілася каля сцен Гальшанскага замка. Госці змогуць пакатацца ў карэце і пачаставацца брэндавым гальшанскім пернікам.

У жыхароў Гродна з'явіцца магчымасць пабываць у казачнай сядзібе ў абласным цэнтры. Дзед Мароз і Снягурка будуць вітаць усіх гасцей у цэнтры рамёстваў «Спадчына». Месца абрана вельмі ўдалае. На пляцоўцы — некалькі цікавых лакацый у этнічным афармленні, у тым ліку навагодняя ёлка з самаробнымі цацкамі ад народных майстроў. Падчас першага прадстаўлення, якое адбудзецца 16 снежня, яна зазіхаціць агнямі.

Лічыцца, што галоўны Дзед Мароз Гродзенскай вобласці пасяліўся на Аўгустоўскім канале. Казачная штаб-кватэра размясцілася на шлюзе Дамброўка ў былым доміку даглядчыка. Дзед Мароз прымае гасцей разам са Снягуркай і водным казачным персанажам Цмокам. У праграме — інтэрактыўныя шоу, майстар-класы, дэгустацыя, забавы і гульні. Працуе тут і навагодняя пошта.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по торгово-общественным помещениям в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» №№ 3.1, 3.2 по г. п., торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г. п.»

Сведения о застройщике

Застройщик: коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

Юридический адрес и местонахождение предприятия: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

Офис продаж: 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

Режим работы офиса продаж: понедельник – четверг: с 8.30 до 17.30, пятница: с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- жилой дом № 6 по ул. Михаловской в г. Минске – 15 мес.;
- жилой дом № 14 по ул. Чюрлёниса в г. Минске – 24 мес.;
- жилой дом № 2 по ул. Михаловской в г. Минске – 13 мес.;
- жилой дом № 32 по ул. Алибегова в г. Минске – 9 мес.;
- встроенные помещения в жилом доме № 6 по ул. С. Есенина в г. Минске, – 5 мес.;
- жилые усадебные дома №№ 1, 3, 5, 7, 9, 11, 13, 15, 17 по ул. Шатило в микрорайоне Сокол в г. Минске – 10 мес.;
- жилые усадебные дома №№ 34, 38 по ул. Антоненко в микрорайоне Сокол в г. Минске – 10 мес.;
- жилые усадебные дома №№ 28, 30, 32 по ул. Докутович в микрорайоне Сокол в г. Минске – 11 мес.;
- жилые усадебные дома №№ 22, 26, 43, 45, 47, 51, 61 по ул. Докутович в микрорайоне Сокол в г. Минске – 12 мес.;
- жилые усадебные дома №№ 30, 32, 36 по ул. Антоненко в микрорайоне Сокол в г. Минске – 12 мес.;
- жилые усадебные дома №№ 24, 49 по ул. Докутович в микрорайоне Сокол в г. Минске – 13 мес.;
- жилой дом № 11 по пер. 2-му Прилукскому – 12 мес.

Информация об объекте строительства

Наименование

«Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» №№ 3.1, 3.2 по г. п., торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г. п.».

Сведения о месте нахождения объекта строительства

Земельный участок для строительства расположен в Московском районе г. Минска, с востока граничит с ул. Семашко, с юга – с территорией существующего патологоанатомического бюро, с запада – с существующей застройкой, в т. ч. специализированной школой № 7, с севера – с существующей усадебной застройкой.

Строительство осуществляется на основании:

- проектно-сметной документации, разработанной на основании актов выбора места размещения земельного участка от 06.03.2018, утвержденного председателем Мингорисполкома 13.03.2018, от 29.05.2019, утвержденного председателем Мингорисполкома 30.05.2019, имеющей заключение, выданное РУП «Главгосстройэкспертиза», от 28.08.2020 № 368-15/20, изменение заключения государственной экспертизы от 22.01.2021 № 368-15/20-Д1;
- решения Минского городского исполнительного комитета от 21.01.2021 № 140 «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства», решения Минского городского исполнительного комитета от 29.04.2021 № 1336 «Об изменении решения Мингорисполкома от 21 января 2021 г. № 140»;
- договора строительного подряда от 02.04.2021 № 11/11, заключенного с УП «Минскметрострой»;
- земельный участок для строительства общей площадью 1,6215 га передан коммунальному унитарному дочернему предприятию «Управление капитального строительства Запад» во временное пользование для строительства и обслуживания объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщины. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске».

Свидетельство о государственной регистрации: № 500/1864-1600 от 11.02.2021.

Цель строительства – возведение торгово-общественных помещений №№ 5.1, 5.2, 5.3 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» №№ 3.1, 3.2 по г. п., торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г.п.».

Сведения об этапах и сроках строительства

Срок начала строительства – апрель 2021 года.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства и ввода в эксплуатацию – 1 квартал 2023 года.

Здания встроенно-пристроенных торгово-общественных помещений – одноэтажные, без технического подполья и чердака. С трех сторон сооружения заглублены в землю, открытыми являются только главные фасады, расположенные вдоль ул. Семашко. Конструктивная схема зданий – монолитный железобетонный рамно-связевый безригельный каркас. Стены и перегородки – кирпичные, монолитные железобетонные.

Кровли зданий – эксплуатируемые с покрытием из бетонной плитки. Торгово-общественные здания запроектированы на отм. -5,600 и включают помещения торгово-общественного назначения, загрузочную, санузлы (в том числе для ФОЛ), помещения уборочного инвентаря, технические помещения (венткамера, водомерный узел, электрощитовая). Высота торгово-общественных помещений от пола до низа выступающих конструкций – 3,3 м.

Входы в здания предусмотрены через тепловые тамбуры с уровня прилегающей территории.

Оконные и дверные блоки выполняются в системе витражей из алюминиевого профиля с остеклением двухкамерными стеклопакетами.

Система отопления торгово-общественных помещений присоединяется к тепловым сетям по независимой схеме. Система отопления двухтрубная, горизонтальная, с установкой распределительных гребенок в каждом торгово-общественном помещении. В качестве нагревательных приборов приняты стальные радиаторы. Запроектирована установка теплосчетчика.

Вентиляция запроектирована приточно-вытяжная с механическим побуждением движения воздуха. Для нагрева приточного воздуха используются установки с электрокалориферами. На входе в тамбуре встроенных помещений установлены электрические воздушно-тепловые завесы.

В торгово-общественных помещениях запроектированы следующие системы: хозяйственно-питьевое (холодное и горячее) водоснабжение, бытовая канализация, внутренние водостоки.

Внутренняя отделка: стены и перегородки – штукатурка, полы – цементно-песчаная стяжка. Чистовая отделка помещений не предусмотрена. Санузлы оборудуются сантехническим оборудованием. Предусмотрена установка счетчиков горячего и холодного водоснабжения, счетчика учета электрической энергии.

В состав общего имущества объекта входят водомерный узел, электрощитовая, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общего назначения, находящееся за пределами или внутри нежилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, элементы озеленения и благоустройства прилегающей территории. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации торгово-общественных помещений.

Застройщик передает общее имущество совместного домовладения (нежилых помещений) после приемки в эксплуатацию объекта представителю товарищества собственников, а если на момент приемки в эксплуатацию объекта товарищество собственников не будет создано – лицу, определяемому общим собранием дольщиков или уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Комплексное благоустройство территории

Устройство проездов и тротуаров с покрытием из мелкоразмерной бетонной плитки, озеленение территории.

Финансирование элементов благоустройства территории производится участниками строительства торгово-общественных помещений.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются торгово-общественные помещения № 5.1, 5.2 по г. п., в том числе:

- торгово-общественное помещение площадью 223,50 кв. м (включая 23,23 кв. м помещения загрузочной);
- торгово-общественное помещение площадью 285,94 кв. м (включая 23,24 кв. м помещения загрузочной);
- торгово-общественное помещение площадью 286,57 кв. м (включая 23,23 кв. м помещения загрузочной);
- торгово-общественное помещение площадью 288,11 кв. м (включая 23,24 кв. м помещения загрузочной).

Стоимость 1 кв. м общей площади объекта долевого строительства в текущих ценах с учетом прогнозных индексов – **5900,00 белорусского рубля с НДС**.

Строительство осуществляется согласно Указу Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь».

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере 20 % от общей стоимости объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – ежемесячно до конца строительства в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 16 декабря 2021 года **по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).**

Для заключения договоров необходимы:

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор;
- для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – учредительные документы.

Срок действия настоящей проектной декларации: до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее, либо до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего задекларированному количеству объектов долевого строительства.

Подробные сведения об объекте долевого строительства, о планировках помещений и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: **220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44, (044) 559 33 91 и на сайте компании ukszapad.by.**

МАРШ, МАРШ ПРАВАЙ

Чаму ў Еўропе разварушыліся папулісты?

У Варшаве прайшоў еўрапейскі «злёт» папулістаў. Лідары найбуйнейшых еўрапейскіх крайне правых і кансерватыўных партый абмеркавалі пытанні ўмацавання далейшага супрацоўніцтва паміж краінамі і стварэння ў перспектыве адзінага нацыянальнага фронту ў межах ЕС, паведаміў Euronews. Пры гэтым кіраўнік французскага «Нацыянальнага аб'яднання» Марын Ле Пен прызнала складанасць фарміравання палітычнай фракцыі, якая аб'яднала б партыі, што цяпер прадстаўляюць дзве групы ў Еўрапарламенце. «Гэта вымагае вялікіх сіл», — прызнала яна. Тым не менш апошнім часам правыя заўважна актывізавалі намаганні ў напрамку цэнтралізацыі адпаведных рухаў. Чаму ў Еўропе разварушыліся папулісты?

ПАМІЖ НАРОДАМ І ЭЛІТАМІ

Пасля падзення камуністычных урадаў у 1989 годзе да ўлады ў краінах былога сацлагера прыйшлі арыентаваныя на заходнія каштоўнасці лібералы. Але ненадоўга. Неўзабаве іх змянілі маховыя кансерватары, заўважыла lenta.ru. Прэм'ерам Венгрыі стаў Віктар Орбан, які дадаў у канстытуцыю згадкі пра хрысціянства, а ў Польшчы — партыя «Права і справядлівасць», якая заканадаўча абмежавала аборты.Тады ў Бруселі гэта спісалі на «палітычную няспеласць» усходнееўрапейцаў. Аднак неўзабаве правыя палітыкі — ці, як іх часта называюць, папулісты (якія апелюючы да меркавання шырокіх народных мас), — пачалі набіраць папулярнасць і ў Заходняй Еўропе. Для кіруючых палітычных эліт гэта стала трывожным сігналам, а новых правых пачалі называць ні многа ні мала спадкаемцамі Гітлера.

«Шведскія дэмакраты», «Аўстрыйская партыя свабоды» і французскі «Нацыянальны фронт» сталі трэцімі па папулярнасці партыямі ў сваіх краінах. «Альтэрнатыва для Германіі» пераможна прайшла рэгіянальныя выбары, а яе саюзнікі з «Пегіды» (Patriotische Europder gegen Islamisierung des Abendlandes — «Патрыятычныя еўрапейцы супраць ісламізацыі Захаду») збіралі шматтысячныя дэманстрацыі ў буйных нямецкіх гарадах. У Вялікабрытаніі еўраскептыкам удалося дабіцца выхаду краіны з ЕС, а ў Італіі правыя папулісты з «Лігі Поўначы» ўвайшлі ва ўрад. Заходняя Еўропа, якая доўгія гады заставалася бастыёнам талерантнасці і хвалёных ліберальных каштоўнасцяў, паддалася «праваму павеву». Усё тое, што вызначала аблічча рэгіёна апошнія 30 гадоў, падвергнулася лютай крытыцы.

Праўда, трэба адзначыць, што сістэма каштоўнасцяў, абапіраючыся на якую тысячу выбаршчыкаў крытыкуюць свае ўрады, даволі эклектычная, адзначыла lenta.ru. Аднак усе еўрапейскія правыя рухі маюць агульныя радавыя рысы, якія аб'ядноўваюць іх прыхільнікаў ад Лісабона да Варшавы. Галоўная тэза сучаснага папулізму — неабходнасць абароны «простага народа» ад карумпаванай эліты, адарваных ад сваіх каранёў. Пры гэтым, як адзначыла дацэнт мюнхенскага ўніверсітэта імя Людвіга і Максіміліяна Брыта Шэленберг, лідары папулісцкіх партый свядома выносяць за дужкі вызначэнне, што менавіта з'яўляецца «народам». Паводле яе слоў, гэта робіцца для таго, каб абысці той факт, што інтарэсы розных сацыяльных груп часта супярэчаць адзін аднаму. У якасці прыкладу яна прывяла «Альтэрнатыву для Германіі», якая адклала пытанне публікацыі сацыяльна-эканамічнай праграмы партыі перад рэгіянальнымі выбарамі ў 2016 годзе, каб не звужаць электаральную базу.

Процістаіць народу, зразумела, эліта, якую лідары папулістаў бачаць такой жа гамагеннай. На іх думку, усё палітычнае жыццё ляпералішняй Еўропы — толькі імітацыя. Палітыкі з «сістэмных» партый адлюстроўваюць барацьбу паміж сабой, хоць насамрэч прадстаўляюць адзін клас і маюць адзіныя інтарэсы, якія заключаюцца ў захаванні ўласнай улады. Прычым тая ж «Альтэрнатыва для Германіі» не саромеецца ў выразах для выкрыцця такой сітуацыі. Напрыклад, яна абвінавачвае вядучыя CMI краіны ў змове з элітамі і выкарыстоўвае тэрмін Lgenpresse («ілжывая прэса»), які актыўна выкарыстоўваўся нацыстамі.

ДЭМАКРАТЫЯ Ў ДЭФІЦЫЦЕ

Першыя 30 гадоў пасля Другой сусветнай вайны ў Еўропе называюць «слаўнай парой». У гэты перыяд пачалася інтэграцыя, адбываўся бурны эканамічны і дэмаграфічны рост, сфарміраваўся шырокі сярэдні клас. З канца 1970-х палітыка еўрапейскіх урадаў усё часцей вызначаецца неаліберальнымі эканамістамі. Справа ў тым, што Стары свет сутыкнуўся з крызісам: старыя эканамічныя рэцэпты перасталі працаваць, і тлумачэнне гэтаму знайшлі менавіта лібералы, якія ўказалі на разадзьмутыя сацыяльныя выдаткі і неэфектыўнасць дзяржаўнай уласнасці.

Еўрапейскія ўрады з удзелам усё тых жа ліберальных эканамістаў прыступілі да маштабных праграм прыватызацыі, скарачэлі сацыяльныя выплаты, перасталі падтрымліваць мясцовых вытворцаў, імкнучыся да максімальнага неўмяшання дзяржавы ў справы бізнесу. Як вынікае з даклада World Inequlity Databes (WID), з 1980 года няроўнасць у Еўропе ўвесь час расце, хай і не такімі тэмпамі, як у ЗША. Аўтары звязваюць гэта менавіта з маштабнымі праграмамі прыватызацыі, якія прайшлі ў Еўропе апошняй чвэрці XX стагоддзя. Узровень жыцця працоўных і часткі сярэдняга класа абваліўся. Бездань паміж светам капітанаў бізнесу, палітыкаў, магнатаў і «простым чалавекам» прыкметна вырасла.

Яшчэ глыбейшы разрыў з элітамі адчуваецца ў маштабах усяго Еўрасаюза. У апошнія гады з ростам уплыву інстытутаў ЕС даследчыкі ўсё часцей гавораць аб існаванні ў аб'яднанні так званага дэфіцыту дэмакратыі. Насельніцтва еўрапейскіх краін удзельнічае напрамую толькі ў выбарах Еўрапарламента, роля якога невялікая. А вось органы, якія непасрэдна прымаюць рашэнні, нікім не абіраюцца, таму грамадзяне ўспрымаюць іх як цалкам непадсправаздачныя.

Тут, дарэчы, і пралягае асноўнае адрозненне правых папулістаў новай хвалі ад класічных ультраправых партый Еўропы, якія выступаюць з падобнай антыбрусельскай і антымігранцкай рыторыкай. Для «старых» правых характэрнае імкненне да жорсткай аўтарытарнай арганізацыі ўлады (што можна бачыць на прыкладзе Орбана ў Венгрыі ці «Права і справядлівасці» ў Польшчы), у той час як новыя папулісты апелююць да дэмакратыі і заяўляюць, што стаяць на варце дэмакратычных працэдур, да знішчэння якіх, на іх думку, імкнуцца сёлетнія эліты з мэтай захавання сваёй улады.

Таму органы ўлады ЕС часта робяцца мішэнню крытыкі для папулістаў. Іх абвінавачваюць у зневажанні нацыянальнага суверэнітэту, спробе знішчыць нацыянальную самасвядомасць, нежаданні ўводзіць пратэкцыянісцкія меры, што нібыта прывяло да гібелі і заняпаду еўрапейскай прамысловасці. Эліты ЕС бачацца папулістам прадстаўнікамі пэўнага «глабалісцкага» праекта, які ў інтарэсах буйнога бізнесу пераводзіць прамысловасць у краіны трэцяга свету (бо рабочая сіла там таннейшая) і ўвозіць мігрантаў, каб знішчыць еўрапейскую ідэнтычнасць.

Дацэнт кафедры камунікатыўных даследаванняў Брусельскага ўніверсітэта Бенджамін Дэ Клін тлумачыць, што ў Еўропе набірае папулярнасць меркаванне, быццам ключавыя рашэнні прымаюцца менавіта невыбіранымі органамі ўлады і часта пры ўдзеле буйнога бізнесу. Гэта прыводзіць да папулісцкіх партый новы электарат, які бачыць у ЕС пагрозу не толькі нацыянальнай ідэнтычнасці, але і дэмакратыі.

МЭТАВАЯ АЎДЫТОРЫЯ

Новы электарат папулісты прыцягваюць і за кошт сацыяльнай рыторыкі. Сучасная Еўропа перажывае крызіс дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту, беспрацоўе сярод моладзі і няўпэўненасць у заўтрашнім дні расце. Аб гэтым сведчаць, напрыклад, вынікі апытання фонду Бертэльсман: паводле яго звестак, 67 працэнтаў еўрапейцаў настальгіруюць па мінулым і не адчуваюць аптымізму адносна будучыні.

Усё гэта супала з крызісам левых партый. Частка з іх была дэмаралізаваная падзеннем Савецкага Саюза, частка перайшла на неаліберальныя пазіцыі, засяродзіўшыся на абароне правоў меншасцяў і забыўшыся пра працоўны электарат. Яго і перанялі правыя папулісты. Нядаўняя сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што асноўная сацыяльная база французскага «Нацыянальнага фронту» — рабочыя і беспрацоўныя, у той час як за левацэнтрысцкую Сацыялістычную партыю часцей галасуюць прадстаўнікі больш забяспечаных пластоў насельніцтва. Рабочыя і беспрацоўныя таксама складаюць аснову электарату «Аўстрыйскай партыі свабоды».

У Германіі ж папулістаў падтрымлівае дробны сярэдні клас, які расчараваўся ва ўладах і адчувае сябе сацыяльна неабароненым. Так, апытанне, праведзенае часопісам Der Spiegel у разгар міграцыйнага крызісу ў 2015 годзе, выявіла страх росту беспрацоўя ў 43 працэнтаў немцаў. З-за наплыву бежанцаў грамадзяне таксама баяліся ўсплёску злачыннасці (51 працэнт) і тэрарызму (54 працэнты). Праз год апытанне прадэманстравала, што 57 працэнтаў нямецкіх грамадзян адчуваюць бяссілле і немагчымасць штосьці змяніць у сваёй краіне.

Але зараз папулістаў падтрымлівае не толькі рабочы клас, але і бізнес. Частка прадпрымальнікаў (перш за ўсё прамыслоўцы) незадаволена тым, што іх прадукцыя не вытрымлівае канкурэнцыі з таннейшымі кітайскімі ці індыйскімі таварамі. Гэтым тлумачыцца тая акалічнасць, што на чале праварадыкальных папулісцкіх партый нярэдка аказваюцца прадстаўнікі вышэйшых пластоў. «Няправільна думаць, што электарат папулістаў — гэта толькі людзі з сацыяльнага дна або тыя, хто канкурыруе з мігрантамі за працу», — адзначае Бенджамін Дэ Клін.

СУМЕСЬ ГНЕВУ І ГВАЛТУ

Еўрапейскія ўрады робяць шмат намаганняў для дыскрэдытацыі гэтых палітычных рухаў. Аднак прычыны, якія дапамаглі ім набраць папулярнасць, не зніклі. Акрамя таго, палітыка дыскрэдытацыі хутка страціць сваю эфектыўнасць. Як лічыць Брыта Шэленберг, спроба выставіць сучасных папулістаў спадкаемцамі аўтарытарных рэжымаў XX стагоддзя можа прывесці да адваротнага эфекту. «Людзі чуюць, што «Альтэрнатыва для Германіі» — гэта нацысты, а потым бачаць, што гэтая партыя выступае за пашырэнне мясцовага самакіравання, напрыклад. У выніку яны разумеюць, што ўрад ім хлусіць. І роўна пра гэта іх папярэджвалі папулісты», — тлумачыць палітолаг. З гэтым згодны і Бенджамін Дэ Клін: «Правыя змаглі даволі пераканаўча даказаць сваім прыхільнікам, што менавіта яны прадстаўляюць простых людзей. У выніку любыя спробы іх крытыкаваць становяцца антынароднымі. І справіцца з імі можна, толькі рэалізоўваючы хоць бы частку іх праграмы».

На апошнім саміце ў Варшаве крайне правыя палітыкі сутыкнуліся з акцыяй протэсту. Дэманстранты назвалі ўдзельнікаў форуму здраднікамі. Як заўважыла нямецкае выданне Handelsblatt, у цені чацвёрткі хвалі каранавіруса нарастае і агульнаеўрапейская хваля протэсту, якую падганяе расплывістая, але ўсё ж выбуханебяспечная сумесь з пачуцця безвыходнасці, гневу і гвалту. Ад Ратэрдама да Бруселя, ад Жэневы да Заграба дзясяткі тысяч людзей даюць волю сваёй незадаволенасці. Гэта спрыяльная глеба для правых рухаў, якія заўважна разварушыліся апошнім часам і разгойдваюць сітуацыю на сваю карысць. Аналітык Войцэх Пшыбыльскі назваў «злёту» Варшаве маркетынгавай стратэгіяй, закліканай стварыць ілюзію адзінства, якога насамрэч не існуе, паведаміў Euronews. «Усё гэта было задумана з адной мэтай — павысіць сваю папулярнасць. У гэтых людзей і партый усё ж розныя задачы і ідэалогія, але яны будуць спрабаваць трымацца разам так доўга, як толькі змогуць, дзеля таго каб у канчатковым выніку не апынуцца на абочыне на наступных выбарах у Еўрапейскі парламент».

«Шведскія дэмакраты», «Аўстрыйская партыя свабоды» і французскі «Нацыянальны фронт» сталі трэцімі па папулярнасці партыямі ў сваіх краінах. «Альтэрнатыва для Германіі» пераможна прайшла рэгіянальныя выбары, а яе саюзнікі з «Пегіды» ((Patriotische Europder gegen Islamisierung des Abendlandes — «Патрыятычныя еўрапейцы супраць ісламізацыі Захаду») збіралі шматтысячныя дэманстрацыі ў буйных нямецкіх гарадах. У Вялікабрытаніі еўраскептыкам удалося дабіцца выхаду краіны з ЕС, а ў Італіі правыя папулісты з «Лігі Поўначы» ўвайшлі ва ўрад.

У выніку еўрапейскае грамадства расколваецца ўсё мацней. Частка моладзі падзяляе меркаванне аб тым, што выбаршчыкі папулісцкіх партый — радыкалы, якія імкнуцца разбурыць еўрапейскія каштоўнасці, а таму цалкам шчыра іх ненавідзіць. У сваю чаргу лектарат папулістаў яшчэ больш пераконваецца ў тым, што ўрад «адарваны ад народа» і не жадае іх слухаць. Сваіх апанентаў яны лічаць «здраднікамі еўрапейскай цывілізацыі». У выніку адзіная Еўропа перажывае куды страшнейшы раскол, чым часы «халоднай вайны». Таму што цяпер лінія падзелу праходзіць унутры кожнага грамадства, яна пралягла паміж сябрамі, калегамі і нават членамі сям'і.

Захар БУРАК.

Правила проведения Рекламной игры «ПРАЗДНУЙТЕ ВМЕСТЕ С ЕВРООПТ»

Настоящие правила проведения Рекламной игры **«Празднуйте вместе с Евроопт»** (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения на территории Республики Беларусь Рекламной игры **«Празднуйте вместе с Евроопт»** (далее – Рекламная игра).

1. Общие положения:

1.1. **Организатор Рекламной игры:** белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью (далее – «Организатор») с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП101132766. Электронный адрес: igra@primary-jwt.by.

1.2. **Наименование Рекламной игры: «Празднуйте вместе с Евроопт».**

1.3. **Территория проведения Рекламной игры**: магазины «Евроопт», «Euroopt PRIME», «Хит! Стандарт», «Хит! Экспресс», находящиеся на территории Республики Беларусь, автомагазины «Евроопт», интернет-магазин e-dostavka.by.

1.4. **Срок начала и окончания Рекламной игры**, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 13.12.2021 г. по 21.01.2022 г.

1.5. **Период, в течение которого можно стать Участником Рекламной игры**: с 13 декабря 2021 г. по 10 января 2022 г. включительно.

1.6. **Состав комиссии по проведению Рекламной игры** (далее – Комиссия):

Председатель Комиссии:

• Куянцев Игорь Юрьевич, заместитель директора СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

Члены Комиссии:

• Зарецкий Вячеслав Сергеевич, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Абрамович Татьяна Владимировна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО;

• Беляев Никита Юрьевич, специалист по медиапланированию иностранного унитарного предприятия «Медиахауз»;

• Головач Светлана Александровна, специалист по работе с клиентами СП «ПРАЙМЭРИ» ООО.

1.7. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра: Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации следующих товаров (по тексту Правил – Игровой продукт):

• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Whiskas, массой нетто 75 г;
• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Whiskas, массой нетто 85 г;
• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Sheba Pleasure, массой нетто 85 г;
• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Sheba Craft, массой нетто 75 г;
• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Sheba Mini, массой нетто 50 г;
• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Pedigree, массой нетто 85 г;
• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Kitekat, массой нетто 85 г;
• Корм консервированный полнорационный, производимый под товарным знаком Perfect Fit, массой нетто 85 г;
• Лакомство для кошек, производимое под товарным знаком Dreamies, массой нетто 30 г;
• Лакомство для кошек, производимое под товарным знаком Dreamies, массой нетто 60 г;
• Лакомство для собак, производимое под товарным знаком Pedigree, массой нетто 110 г;
• Лакомство для собак, производимое под товарным знаком Pedigree, массой нетто 180 г;
• Лакомство для собак, производимое под товарным знаком Pedigree, массой нетто 270 г.

2. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры:

2.1. К участию в Рекламной игре допускаются достигшие возраста 16 лет физические лица – граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь (имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь).

2.2. Участником Рекламной игры не может быть член Комиссии по проведению Рекламной игры, а также лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

2.3. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами, принятие ими на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

2.4. Для участия в Рекламной игре необходимо в период времени с 13 декабря 2021 г. по 10 января 2022 г. включительно:

